N 105

ПАД СЬЦЯГАМ ЛЕНІНІЗМУ-ДА ДАЛЕЙШЫХ ПЕРАМОГ!

ЮБІЛЕИ АГЛЯДУ І МОБІЛІЗАЦЫІ

Красная Смена — Чырвоная Зьмена

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Чырвоная Зьмена — Орган Цэнтральнага Камітэту Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

Сцэмантаваныя крывёю і волею агністых дзён змаганьня за соцыялізм

Ад бальшавікоў Савецкай Беларусі баявое прывітаньне газэце Чырвонаштандарнага Комсамолу ў дзень яе дзесяцігадовага юбілею.

У бальшавіцкім календары дзесяць год—гэта вялізарнейшая колькасьць агністых дзён змаганьня за соцыялізм!

Старонкі нумароў газэты за мінуўшыя дзесяць год—гэта сцэмантаваная крывёю і волевай напружнасьцю старонкі славутай гісторыі Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі.

Быць і надалей непахісным змагаром за генэральную лінію партыі, супроць ныцікаў, малавераў і капітулянтаў, за разгорнутую пролетарскую самакрытыку, за далейшыя посьпехі соцыялістычнай індустрыі, за ліквідацыю кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, за пяцігодку ў 4 гады—асноўная задача газэты.

„Чырвоная Зьмена" і надалей павінна з яшчэ большай настойлівасьцю і размахам, з яшчэ большым бальшавіцкім агнём мобілізоўваць мільённыя масы працоўнай моладзі Беларусі на барацьбу за аўладаньне вышынямі трэцяга, рашаючага году, за няўхільнае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі і рашучую барацьбу з усялякімі яе скажэньнямі, за „518" і „1040", за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за соцыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі і аўладаньне тэхнікай.

Няхай жыве „Чырвоная Зьмена"—баявая газэта другога бальшавіцкага пакаленьня!

Няхай жыве ударная брыгада будаўнікоў соцыялізму—Ленінскі Комсамол Беларусі і яго кіраўнік КП(б)Б.

Сэкратар ЦК КП(б)Б Шарангович.



„Чырвонай Зьмене"

Табе,
　наш сейбіт комсамольскі,
Наш верны
　вартавы Саветаў,
Табе,
　ударная „Чырвонка",
Я прысьвячаю
　　песьню гэту!...

———

Грыміць у клясавых баёх,
У бурнай працы
　　на заводах,
Ўзрывае межы на палёх
Твая юнкораўская рота!
Ты клічаш
　　з ворагам змагацца
Ты сьмела рвеш
　найдэмства сеці.
Праменьні слоў
　тваіх юнацкіх
Нам
Шляхаводнай зоркай
　сьвецяць!
І каб зьяднаць
　адною сілай
Тых,
Хто у будучыню верыць,—
Ячэйка наша
　абвясьціла
Набор
　імя „Чырвонай Зьмены"!!!
Краіны нашай
　заваёвы
Мацуй, гартуй,
Мая „Чырвонка"!
Няхай гарыць
Ў агні будовы
Тваё
　ударніцкае вока!

Агняцьвет

10 ГОД

Сёньнешняе сьвята „Чырвонай Зьмены"—гэта сьвята ўсёй комсамоліі Беларусі.

І кожнае сьвята комсамоліі—гэта сьвята ўсёй пролетарскай грамадзкасьці. Усяго маладога пакаленьня рабочае клясы ў першую чаргу.

Сьвяткаваньне 10-гадовага юбілею адбываецца ў дні, калі ўся краіна будуючагася соцыялізму штурмуе вышыні 3-га, рашаючага году пяцігодкі, дабудоўвае фундамант соцыялізму. Гэта азначае характар і зьмест нашага сягоньнешняга сьвята.

Галоўнае:

— агляд мінулага пэрыоду барацьбы,

— мобілізацыя комсамольцаў і працоўнай моладзі на барацьбу за штодзённую, штохвілінную рэалізацыю ленінізму,

— намячэньне далейшых баявых задач органу беларускай комсамоліі.

Гэта павінна быць дамінуючым у нашым юбілеі. У гэтым яго політычнае апраўданьне.

Шлях барацьбы, росту, перамог

Ад газэткі, якую тварылі некалькі энтузіястых—да газэты, якую твораць сотні і тысячы для дзесяткаў тысяч.

Ад газэткі, якая выходзіць адзін раз у тыдзень—да газэты штодзённай.

Ад газэткі з абмежаваным колам некалькі сот чытачоў—да газэты 40 тысяч чытачоў.

Такія зьнешнія, колькасныя азнакі нашага росту.

Наша „Чырвоная Зьмена" цягне ваё спаваньне ад нелегальнага комсамольскага друку Беларусі, ад „Факела Коммунизма".

Наша „Чырвоная Зьмена" у пачатку дыхала паветрам грамадзянскае вайны.

Гісторыя комсамольскай ячэйкі—гісторыя беларускага комсамолу,—гісторыя „Чырвонай Зьмены". І наадварот.

Ад героізму, самаахвярнасьці на барыкадах грамадзянскай вайны—да героізму і энтузіязму ў соцыялістычным будаўніцтве,—такі шлях беларускага (і ўсесаюзнага) комсамолу. Такі шлях „Чырвонай Зьмены". І гэта шлях барацьбы, росту, перамог.

У барацьбе за генэральную лінію партыі

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена" змагалася за генэральную лінію партыі. Упарта, бязупынна змагалася за яе. Пропагандавала яе. Агітавала за яе. Мобілізавала комсамольцаў, маладых рабочых і працоўных за ажыцьцяўленьне яе. Актывізавала гэтыя масы.

Комсамольская армія Беларусі была і ёсьць і будзе верным дапаможнікам КП(б)Б Баявы орган беларускай комсамоліі—быў, і ёсьць і будзе верным рупарам і памочнікам КП(б)Б,

У барацьбе на два франты рос і мацаваўся ленінізм, генэральная ленінская лінія партыі. Барацьба на два франты—была і засталася важнейшай задачай нашай організацыі і яе сёньнешняго юбіляра—„Чырвонай Зьмены".

Барацьба на два франты азначае барацьбу супроць правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць левых загібаў, якія пераплятаюцца і вядуць да права-опортуністычных спраў і супроць прымірэнчых адносін да ўсяго гэтага. Гэтая барацьба на два франты актыўна вядзецца і „Чырвонай Зьменай". У ёй газэта выхоўваецца.

Ленінская нацыянальная політыка адна з важнейшых састаўных частак агульнай генэральнай лініі партыі, ажыцьцяўляецца ў барацьбе супроць вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму—галоўнай небясьпекі, супроць контррэволюцыйнага беларускага нац. дэмократызму, супроць шовінізмаў усіх іншых адценьняў і колераў. Гэта барацьба была і засталася штодзённай задачай нашай організацыі і яе органу—„Чырвонай Зьмены". У гэтай барацьбе беларуская комсамолія і яе газэта выхоўваецца.

Пад кіраўніцтвам партыі і ЦК ЛКСМБ наша газэта вяла колёсы чырвонай зьмены за рэалізацыю генэральнай лініі партыі. Гэта першы і важнейшы вынік нашага юбілею. Радасны вынік. Вынік, якім мы маем права ганарыцца.

Колектыўны організатар

Уладзімер Ільліч ўжо на зары бальшавізму сказаў; бальшавіцкі друк—гэта ня толькі колектыўны агітатар і пропагандысты, але і колектыўны організатар.

І лепшы вучань Леніна, тав. Сталін, сказаў: друк—самая вострая і самая моцная зброя партыі

Задачы бальшавіцкага друку—гэта задачы комсамольскага друку. Комсамольскі друк вучыцца ў бальшавіцкага, выхоўваецца на ім, прымае яго баявыя традыцыі.

„Чырвоная Зьмена" адна з старэйшых комсамольскіх газэт у Савецкім Саюзе. „Чырвоная Зьмена"—гэта зьвяно ў вялізарным ланцугу нашага бальшавіцкага і комсамольскага друку.

Газэце мала быць фіксатарам, рэгістратарам. Мала фотографаваць нашу рэчаіснасьць. Трэба яе організаваць. Трэба мобілізаваць мільёны ў барацьбе за лінію партыі. Тут патрабуецца кіраваць узрастаючай актыўнасьцю і творчаю ініцыятывай масы.

Многа прыкладаў з апошняга часу сьведчаць аб тым, што „Чырвоная Зьмена" становіцца на гэты шлях.

Пляны конкрэтных дзеяньняў комсамольскіх організацый у розных галінах работы, організацыя соцыялістычнага конвэеру якасьці, паход за тэхніку, барацьба за стандартызацыю будаўніцтва, конкрэтная і опэрацыйная барацьба за аздараўленьне транспорту, барацьба за ператварэньне Беларусі ў тарпяны Донбас, барацьба за тое, каб Беларусь да канца пяцігодкі перайшла на тарпяны апал, опэрацыйная работа сельска-гаспадарчых спэцыялізаваных брыгад, барацьба за ліквідацыю абязьлічкі ў соцсэктары сельскай гаспадаркі, барацьба за выкарыстаньне хронометражу на службу колектывізацыі, агляд-праверка беларускай комсамольскай організацыі ў галіне ажыцьцяўленьня важнейшых рашэньняў IX і X комсамольскіх зьездаў—усё гэта сьведчыць, што наш юбіляр пасьпяхова выконвае пастановы X комсамольскага зьезду Беларусі аб пераключэньні сваёй работы ў бок апэрацыйнасьці, у бок распрацоўкі злабадзённых пытаньняў соцбудаўніцтва, у бок практычнай дапамогі комсамольскім організацыям.

Пад пражэктарам самакрытыкі

Пролетарская самакрытыка ёсьць самая моцная і вострая зброя бальшавіцкага друку. І сам друк павінен быць падпарадкаваны гэтай самакрытыцы.

У дзень юбілею „Чырвонай Зьмены"—возьмем пад пражэктар самакрытыкі яе памылкі і недахопы!

„ЧЗ", пры, у асноўным, правільнай політычнай лініі, зрабіла некаторыя памылкі. Важнейшыя з іх за апошні пэрыод—зробленая памылка авангардысцкага характару ў нумары, прысьвечаным Кастрычнікавай рэволюцыі, памылка прымірэнчага характару ў справе Целешава, памылка права-опортуністычнага характару ў пытаньнях міжнароднага рабочага руху, памылка ў Дукорскай справе.

Праз самакрытыку, пад кіраўніцтвам партыі і Цэнтральнага Камітэту комсамолу, гэтыя паасобныя памылкі газэтай былі выпраўлены. Яшчэ больш: „ЧЗ" улічыла вурокі гэтых памылак, каб іх больш не паўтараць, каб іх пазьбегнуць.

„ЧЗ" яшчэ мае многа недахопаў. Галоўным чынам і перш за ўсё па лініі незаўсёднага завяршэньня пачатых мерапрыемстваў, па лініі масавай работы з юнкорамі, па лініі асьвятленьня міжнароднага рабочага руху, юнацкага руху ў Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіне ў першую чаргу.

Юбілейная кампанія павінна служыць маторам, які паскорыў-бы выжыцьцё гэтых недахопаў і палепшаньне якасьці газеты.

Далейшыя задачы

І аб далейшых асноўных зададачах. Пад знакам формуляваньня гэтых задач павінен прайсьці юбілей

Мобілізацыя ўсіх сіл комсамолу і творчай актыўнасьці маладога пакаленьня рабочае клясы і працоўных на выкананьне пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі, соц. рэконструкцыю сельскай гаспадаркі, на пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі. У аснове гэтай работы павінна ляжаць ня голая констатацыя фактаў, а організацыя і мобілізацыя мас на вырашэньне ўсёй сумы задач бягучага этапу рэконструкцыйнага пэрыоду.

Узмацненьне сувязі з масамі комсамольцаў, рабочай і працоўнай моладзьдзю, узьняцьце ідэйна-політычнага ўзроўню, больш шырокае асьвятленьне ваенізацыі комсамолу і кіраўніцтва юнкорамі, на аснове апошняй пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху. Рашаючым зьвяном перабудовы рабселькораўскага руху зьяўляецца барацьба за самае шырокае разьвіцьцё брыгад друку. На гэтым шляху „Чырвоная Зьмена" забясьпечыць далейшае якаснае павышэньне яе самакрытыкі, масавасьць у яе рабоце, умацненьне опэрацыйнасьці і дзейнасьці газэты.

І перш за ўсё, і галоўным чынам,—непрымірымая барацьба за генэральную лінію партыі, за ленінскую нац. політыку, рашучае выкрыцьцё опортуністых і капітулянтаў справа і „зьлева", бязьлітасная барацьба з усімі, хто перашкаджае пераможнаму соцыялістычнаму наступленьню па ўсім фронце. З усёй сілаю выкрываючы клясавага ворага, „ЧЗ" павінна павысіць сваю клясавую дбайнасьць.

Гэта асноўныя задачы колектыўнага організатара мільёнаў—бальшавіцкага друку. Гэта і асноўныя задачы юбіляра. У рэалізацыі гэтых задач ляжыць гарантыя таму, што і далейшы шлях „Чырвонай Зьмены" будзе шляхам яшчэ большых перамог.

Вышэй баявы штандар комуністычнай партыі—ленінізм!

Няхай жыве комуністычная партыя—організатар соцыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве комсамол—ударная брыгада соцыялізму!

Няхай жыве „Чырвоная Зьмена"—баявы орган беларускай комсамоліі!

ЦК ЛКСМБ

№ 105 (1374) | НЯДЗЕЛЯ, 10-га мая 1931 г.

Разгорнем рэвалюцыйнае спаборніцтва

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА — дзьвёх братэрскіх газэт — Junge Garde

Рэдакцыі газэты „Юнге Гардэ“

Таварышы па клясе і змаганьню

Цэнтральнай газэце беларускага комсамолу—„Чырвонай Зьмене“ сёньня спаўняецца 10 год.

Перамагаючы супраціўленьне клясавага ворага, яго агентуры-правых і левых опортуністых, праводзячы бязьлітасную барацьбу з ухіламі ад ленінскай нацыянальнай політыкі, газэта ў рабоце комсамолу Беларусі была магутнай зброяй інтэрнацыянальнага выхаваньня мас комсамольцаў і працоўнай моладзі, організуючы іх на практычны ўдзел у гаспадарчым і культурна-нацыянальным будаўніцтве.

Ва ўзьнятым па ініцыятыве ленінскага комсамолу соцыялістычным спаборніцтве, газэта, які ўвесь комуністычны друк, адыгравала вялікую организуючую ролю. Соцыялістычнае спаборніцтва, якое „ёсьць выражэньне вялавой рэволюцыйнай самакрытыкі мас, што апіраецца на творчую ініцыятыву мільёнаў працоўных“ (Сталін) падхоплена усёй рабочай клясай і сформулявана ў лёзунгу „Пяцігодка—у 4 гады“.

Выканаўшы з посьпехам задачы двух мінулых год пяцігодкі, рабочая кляса СССР з колгасьнікамі і бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства, уступіла ў трэці, рашаючы год пяцігодкі. год завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Аб гэтых лічбах павінны ведаць і вы, таварышы

Лічбы перамог гавораць за сябе. Валавая продукцыя прамысловасьці СССР пяцігодкай вызначалася на 1929-30 гаспадарчы год у 29,3 млн. рублёў. а выканана на 30,5 млр. руб., гэта значыць п равышана на 120 млр. рублёў.

Па СССР ужо зараз колектывізавана больш 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Пасеўплошча па СССР у 1928 годзе раўнялася 118 млн. га, а ў 1929-30 годзе пашырылася да 127,8 млн. га.

Дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі, Савецкая Беларусь—баявы форпост Савецкага Саюзу—мае таксама вялікія дасягненьні.

Валавая продукцыя прамысловасьці БССР пяцігодкай вызначалася ў 2 313.690 тыс. рублёў, а ў 1931 годзе будзе раўняцца 1573.091 тыс. руб., альбо за тры гады пяцігодкі будзе выканана на 68 проц. зарплата па БССР у 1931 годзе павысілася на 19,7 проц.

Каля 25 проц бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Савецкай Беларусі знаходзіцца ў колгасах. Расьце пасеўная плошча. Калі ў 1930 годзе было 3633,7 тыс. га, то ў 1931 годзе будзе 4083 тыс. га.

У Савецкім Саюзе ўжо ліквідавана беспрацоўе.

У бягучым—3-м рашаючым годзе пяцігодкі—будзе пушчава 518 новых завод ў і фабрык, 1040 машынатрактарных станцый. Аб гэтых лічбах павінны ведаць і вы, таварышы! Ведаць таму, што на шы перамогі зьяўляюцца і вашымі перамогамі, таму, што перамогі СССР—гэта перамогі ўдарнай брыгады сусьветнага пролетарыяту.

Нашы перамогі зьяўляюцца і вашымі перамогамі

Капіталістычны сьвет душыцца ў ціскох экономічнага крызісу. Крызіс. якому ня было яшчэ падобных дагэтуль, з вялізарнейшым цяжарам абрушваецца на рабочыя і сялянскія масы капіталістычных краін. Мы ведаем што па ўсіх краінах капіталу больш 40 млн. беспрацоўных, тады як у СССР няма ніводнага беспрацоўнага. Выхад з крызісу буржуазія шукае ва ўзмацненьні наступу на рабочую клясу, узмацненьні тэрору і ў падрыхтоўцы вайны, галоўным чынам, супроць яго соцыялістычнай бацькаўшчыны—СССР.

Мы выконваем, таварышы, інтэрнацыянальную задачу—пасьпяховага будаўніцтва соцыялізму ў СССР і ўзмацненьня яго абароназдольнасьці. Мы сочым за вашай работай і радуемся вашай барацьбою так, як ведаем, вы радуецеся, і сьвяткуеце нашы перамогі.

Комсамол БССР, як і ўсяго Савецкага Саюзу, у тым ліку і наша газэта з абурэньнем протэставалі супроць забароны 6 усенямецкага зьлёту комсамолу. Наша Менская організацыя комсамолу адгукнулася на выклік лейпцыгскіх комсамольцаў і ўступіла з імі ў соцыялістычнае спаборніцтва. якое зьяўляецца лепшым мэтодам інтэрнацыянальнай сувязі. Практычным удзелам у соцыялістычным будаўніцтве і ўзмацненьні інтэрнацыянальнай сувязі мы падтрымліваем вашу барацьбу.

Давайце разгорнем рэволюцыйнае спаборніцтва

Давайце, таварышы, у адзнаку 10-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“ і падрыхтоўкі да 17 МЮД'у разгорнем рэволюцыйнае спаборніцтва паміж газэтай беларускага комсамолу „Чырвонай Зьменай“ і нямецкага „Юнге Гардэ“.

У парадку выкананьня рашэньняў IX зьезду УсеЛКСМ і X ЛКСМБ мы бярэм на сябе абавязкі:

1. Дапамагчы організацыі комсамолу ў парадку падрыхтоўкі да МЮД'у прапрацаваць рашэньні апошняга пленуму ВККІ.

2. Сыстэматычна асьвятляць на сваіх старонках барацьбу комсамолу Нямеччыны і выкананьне соцыялістычнага спаборніцтва пам'ж Менскай і Лейпцыгскай комсамоліяй.

3. Разгарнуць работу па аказаньню матар'яльнай дапамогі праз МОПР і сувязі з комсамолам Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны.

4. Ажыцьцяўляючы задачы выкананьня 5-годкі ў 4 гады, забясьпечыць барацьбу за 100 проц. ахоп працоўнай моладзі соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, за перавод яго на вышэйшую ступень і ў галіну тэхнікі.

5. Змагацца за выкананьне высунутай задачы: ператварыць БССР у тарпяны Донбас.

6. Выконваючы задачы 45 проц. колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Беларусі на працягу 3-га рашаючага г. пяцігодкі, і ажыцьцяўленьня ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі организаваць у адным колгасе ляборатрыю „Чырвонай Зьмены“ па правільнай організацыі працы, пераводу на зьдзельшчыну, ліквідацыі абязьлічкі, рацыяналізацыі і хронометражы сельска-гаспадарчых процэсаў, пераносячы гэты вопыт ва ўсе колгасы БССР.

7. Змагацца за сканчэньне ў тэрмін і поўнае выкананьне плянаў сяўбы і спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, за бальшавіцкую ўборку ўраджаю, разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

8. Наш лёзунг—кармовы Перакоп павінен быць узяты, таму разгарнуць работу па стварэньню моцнай кармовай базы для соцыялістычнай жывёлагадоўлі, змагацца за мільён тон сілосу і 500 тыс. га сілосных культур.

9. Забясьпечыць работу па ператварэньню комсамолу ў шматмільённую організацыю, ажыцьцяўляючы лёзунг: ахапіць рабочую моладзь на 100 проц. комсамолам і стварыць у кожным колгасе, саўгасе комсамольскую ячэйку.

Мы выклікаем вас на соцыялістычнае спаборніцтва па выкананьню рэволюцыйных задач у барацьбе з фашысцкай дыктатурай за пашырэньне ўплыву комсамолу сярод рабочай і працоўнай моладзі, за разлажэньне соцыял дэмократычных організацый моладзі—за Савецкую Нямеччыну.

Рот фронт!

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

Комсамольская дэмонстрацыя у Нямеччына

АРГАНІЗАТАР З ПАДПОЛЬЛЯ

Ня гледзячы ні на які тэрор комуністычны друк робіць сваю рэволюцыйную справу. Возьмем хаця-б некаторыя прыклады апошняга часу з жыцьця падпольнага комуністычнага друку Польшчы, Зах. Беларусі і Украіны.

У Польшчы выходзіць газэта „Чырвоны Штандар“ орган ЦК компартыі Польшчы. Газэта ЦК комсамолу—„Таварыш“.

Перад Першым Мая партыя пачала выданьне шэрагу новых газэт.

Таксама ёсьць вялікі зрух у выданьні заводзкіх шматтыражак.

На 3-х буйнейшых мэталюргічных заводах Варшавы пачалі выдавацца газэты „Паравоз“, „Норгблін“ і „Лільпоп“ Таксама ў Варшаве выходзіць „Чырвоная электростанцыя“ і ў Гуце Банкавай „Чырвоны ліцейшчык“.

Да Першага Мая выдаў рад газэт і ЦК компартыі Заходняй Беларусі: „Чырвоны сьцяг“ на беларускай мове, „Да волькі“ (да барацьбы) —на польскай мове, „Бальшавік“—на яўрэйскай мове, „Малады комуністы“—на трох мовах. На Заходняй Украіне вышлі газэты „Прапор комунізму“, „Касярня для салдат“ і іншыя. ЦК Мопр'у Заходняй Украіны, як і ЦК МОПР'у Заходняй Беларусі, таксама выдаў свой орган „Чырвоная дапамога“.

Такое разьвіцьцё комуністычнага друку зьяўляецца неадлучнай часткай разьвіцьця рэволюцыйнага руху сярод працоўных мас Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны ва ўмовах паглыбленьня крызісу і ў адказ на жорсткі тэрор польскага фашызму.

Гэтыя газэты, пры ўсіх недахопах, нясуць у масы лёзунгі компартыі і Комінтэрну і організуюць іх у рэволюцыйным змаганьні.

Орган ЦК Комсамолу—„Таварыш“—у адным з сваіх нумароў надрукаваў нэкралёг: „Тав. Чэслаў Баякоўскі, рабочы цагельнага заводу, член раённага камітэту комсамолу Польшчы ў Валяміне і мясцовага камітэту ў Маркахва ўзросьце 19 год загінуў сьмерцю рэволюцыянэра ў змаганьні з паліцыяй, абараняючы сьцяг на чале дэмонстрацыі беспрацоўных у Марках. Ушануем памяць салдата рэволюцыі!“

Так, усе радкі гэтых газэт прасякнуты рэволюцыйным змаганьнем. Праз перашкоды, якія чыніць крывавы тэрор і расправы над рэволюцыянэрамі, яны нясуць у масы комуністычныя лёзунгі і організуюць іх для рашаючых боек з капіталам.

М.

РУПАР РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ МОЛАДЗІ НЯМЕЧЧЫНЫ

„ЮНГЕ-ГАРДЭ“ („Маладая гвардыя“)—„газэта працоўнае моладзі гораду і вёскі“, цэнтральны орган комсамолу Нямеччыны.

Ужо 13 год „Маладая гвардыя“ заваёўвае позыцыю за позыцыяй у барацьбе за савецкую Нямеччыну. Ужо 13 год „Маладая гвардыя“ стаіць на варце інтарэсаў працоўнае моладзі. 13 год існуе гэты баявы рупар.

Да нядаўняга часу комсамол меў некалькі абласных пэрыодычных выданьняў. У сувязі з тым, што з першага студзеня 1931 году меркавалася ператварыць „Маладую гвардыю“ у штодзённую газэту, адбылася цэнтралізацыя. Для соцыял-фашысцкага поліцэй-прэзыдэнта Бэрліна гэта ўжо было занадта—і яшчэ да першага студзеня газэта была забаронена на тры месяцы. Рэпрэсіі часова затрымалі ператварэньне „Маладой гвардыі“ у штодзённую газэту. Але толькі часова. Цяпер газэта выходзіць два разы ў тыдзень, але ўжо ў бліжэйшым будучым „Маладая гвардыя“ будзе штодзённа заклікаць да барацьбы, да перамогі.

„Маладая гвардыя“ —гэта істотны хлеб кожнага маладога рабочага Нямеччыны. Яна—яго газэта. Там ён знаходзіць неабходны матар'ял для барацьбы супроць капіталістычнага нявольніцтва, для барацьбы супроць прыслужнікаў гэтага нявольніцтва—фашысцкіх і соцыял-фашысцкіх бонз. Газэта дае яму факты, з якіх ён бачыць, што тысячы маладых пролетарыяў разьдзяляюць яго долю і вядуць такую-ж жорсткую барацьбу, як і ён, „Маладая гвардыя“—зьвязваючае зьвяно пролетарскай моладзі Нямеччыны.

У комсамольца—„штурмавы квартал“. „Маладая гвардыя“ мобілізавана. Іх штодзённа яна кліча, дае ўказаньні, хваліць, ганьбуе, стаіць у цэнтры баявога поля.

* * *

Калі і ліквідаваны абласныя газэты комсамолу, дык гэта яшчэ ня значыць, што комсамол Нямеччыны абмяжоўваецца толькі „Маладой гвардыяй“. Кожная комсамольская ячэйка, кожная мясцовая група комсамолу выдаюць свае газэты—шматтыражкі. Для разьвіцьця рэволюцыйнага руху, для барацьбы супроць супраціўніцкіх організацый, гэтыя шматтыражкі маюць вялізарнейшае значэньне. Яны закранаюць самыя важныя моманты з жыцьця данае фабрыкі, данае мясцовасьці. На прыкладах, усім вядомых, на момантах, узятых з жыцьця данага месца, яны робяць самыя важныя політычныя вынікі.

Гэтыя шматтыражныя „насьценгазэты“ даходзяць да кожнага, і часам конкуруюць у сэнсе распаўсюджваньня з друкарнымі і партыйнымі органамі. Часам яны даюцца дарма, ці за самую мінімальную цану,—нават самы абяднеўшы беспрацоўны купляе іх, распаўсюджвае іх. Гэтымі газэтамі, друкаванымі на ротатарах, партыя, комсамол і бліжэйшыя да іх організацыі ахопліваюць мільённыя масы працоўных гораду і вёскі.

Вось некалькі экзэмпляраў газэты „Антыфашысцкая маладая гвардыя“, баявой організацыі працоўнае моладзі Нямеччыны. Газэта называецца „Дэр юнге Антыфашыст“. У сэнсе вонкавага выгляду газэта яшчэ ня зусім аформлена. Але затое якім баявым энтузіязмам гучыць кожнае слова гэтай невялікай старонкі. Кароткі зьмест газэты:

Заклік да тэкстыльшчыкаў удзельнічаць у забастоўцы;

Артыкул аб здрадніцкай ролі нацыянал-соцыялістых з ганебнымі фактамі;

Заклік к 6-му агульнанямецкаму дню моладзі ў Бэрліне.

Але яшчэ лепш пастаўлены фабрычныя газэты, якія выдаюцца ячэйкамі гэтай організацыі.

Вось газэта „Алярм“ (трывога), выданая ячэйкай „Антыфашысцкай маладой гвардыі“ на фабрыцы „Тытэль ун Кругер“ у Лейпцыгу. у сувязі з перавыбарамі фабзаўмясцкому,

„Уперад—па шляху Леніна!“

— Кліча газэта працоўную моладзь фабрыкі.—„Зразумейце вашу сілу—змагайцеся за пролетарскую рэволюцыю—галасуйце за сьпіс № 4.

У праціўным выпадку — споўніцца жаданьне фашызму. Да гэтага ілюстрацыя: фашысты і соцыял-фашысты душаць рабочага, хочуць адабраць у яго апошняе. А як жывуць соцыял-фашысцкія бонзы? Шэйдэман мае ка...

Тав. Проко.

...штоўныя паперы на 91.400 марак. Могуць яны абараняць нашыя інтарэсы? Вырашай, пролетары!“

Гэткім-жа чынам зьвяртаюцца да рабочых: газэта „Сыгнал“ — орган ячэйкі „Волкемэрэй“, аднэй з самых вялікіх тэкстыльных фабрык Лейпцыга, газэта „Дэр ротэ Ангрыф“ (Чырвоны наступ)—орган ячэйкі тэкстыльнай фабрыкі „Шпінэрэй Пфафэндорф“, газэта „Штурм ауф Штоер“—орган ячэйкі тэкстыльнай фабрыкі Штоер

Небясьпека зачыненьня рэволюцыйнай прэсы фашысцкім урадам Брунінга і яго соцыял-фашысцкімі поліцэй-прэзыдэнтамі ўсё больш павялічваецца. Лепшая падрыхтоўка да гэтага нападу фашызму, ёсьць павялічэньне тыражу і ўплыву гэтых шматтыражак.

Прэсу рэволюцыйнага пролетарыяту Нямеччыны, прэсу яго рэволюцыйнай моладзі нельга ўзяць тэрорам. На месца аднэй зачыненай газэты вырастаюць дзесяткі новых. Прэса компартыі і комсамолу прайшла ўжо сваё баявое хрышчэньне і паказала сваю баяздольнасьць. І ў далейшым яна не адступіць—не аддасьць ні аднае пядзі сваіх позыцый.

А. ПРОКО.

ГІСТОРЫЯ КОМСАМОЛЬСКАЙ ЯЧЭЙКІ—ГІСТОРЫЯ ЛКСМБ—ГІСТОРЫЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

„Ва ўсёй гісторыі рэволюцыйнай барацьбы рабочых і сялян Беларусі найвялікшую ролю іграла моладзь... У самыя цяжкія дні нашай рэволюцыі яна была стрыжнем і апорай комуністычнай партыі“ (КНОРЫН)

10 год „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“—10 СЛАЎНЫХ СТАРОНАК У ГІСТОРЫІ КОМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

(З прывітальнай тэлеграмы газ. „Зьвязда“)

Тав. Кнорын.

ЧАКАЕМ БАЯВЫХ РАПАРТОЎ

Прывітаньне „Чырвонай Зьмене“

Ад імя рабселькораў БССР вітаем баявую газэту чырвонасьцяжнага ленінскага комсамолу—„Чырвоную Зьмену“ з 10-гадовым юбілеем. Шматтысячны атрад юнкораў, зьяўляючыся неадлучнай часткай рабселькораўскага руху, быў і ёсьць надзейны памочнік партыі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне пяцігодкі ў чатыры гады, за генэральную лінію партыі.

Мы ўпэўнены, што „Чырвоная Зьмена“ і яе юнкораўская організацыя з бальшавіцкім запалам у самы хуткі час перабудуе сваю работу, згодна наказаў X зьезду ЛКСМБ і апошкіх дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і пастаноў Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

Чакаем ад „Чырвонай Зьмены“ і юнкораў баявых рапартоў да надыходзячага ўсебеларускага зьезду рабселькораў аб перамогах і дасягненьнях на гэтым важнейшым вучастку работы.

Рэдакцыя газэты „Рабселькор“

11 ГОД ЛКСМБ—10 ГОД „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

...ыў тысяча дзевяцьсот восемнаццаты год...

...грымотных бойках грамадзянскай вайны адна за аднэй у розных гарадох і мястэчках Беларусі нараджаюцца першыя комсамольскія організацыі.

...а платох, брамах і дамох зьяўляюцца нязграбна надрукаваныя, ...а напісаныя ад рукі, адозвы, ...заклікаюць рабочую моладзь ...упаць у рады КСМ.

— Да вас, юныя пролетарыі го... Віцебску, да вас, эксплёатаваных і ўціснутых, зьвяртаемся мы,—...ак пачынаецца адозва дэлегатаў ...нага Ўсерасійскага зьезду КСМ ...маладых пролетарыяў гораду Ві...ску па пытаньню падрыхтоўкі ...ьвяткаваньня першай гадавіны ...трычнікавай рэволюцыі.

...дозва заканчваецца заклікам: „У ...дзень—усе пад сьцяг Комуні...нага Саюзу Моладзі“.

...сьлед за выпускам адозвы, у па...ку лістапада пачынаецца агульнагарадзкі сход рабочае моладзі, на ...стварaецца комсамольская ор...зацыя Віцебску.

...цэнтры БССР—Менску комса... нараджаецца ў першую палову ...жня 1918 году.

...-га лютага 1919 году ЦК КСМ ...арусі зьліваецца з саюзам Літвы, ...эпяга сакавіка ў Вільні выхо...ь папярэднік нашага баявога ...іяру—„Чырвонкі“—часопіс „Фа... комунізму“—орган цэнтральнага Віленскага ка-ту ЦК КСМ Літвы ...еларусі. У гэтым-жа нумары мяецца ...іфэст да ўсёй рабочай моладзі.

...устыя, чорныя хмары пачалі ...упаць Савецкую Беларусь, якая ...ські што вызвалілася ад нямецкай акупацыі. Абшарніцкая Польшча пры дапамозе Антанты пачала ...тупаць на нас. Белапалякі на ...м шляху зьнішчалі мірныя вёскі, гарады. Комсамол у гэты час ...кіраўніцтвам партыі кідае ўсе ...е лепшыя сілы для абароны Савецкай Беларусі ад наступленьня белапольскіх легіёнаў. „Комсамол ...эцца за стрэльбу“, усе да аднаго ...раўляюцца на фронт, каб адацьць, не падпусьціць белапалякаў ...Савецкай Беларусі.

...комсамольскіх організацыях асноўным лёзунгам зьяўляецца: „кожны комсамолец павінен авуладаць зброяй“.

— „Усе комсамольцы, якія дасягнулі 15-гадовага ўзросту, павінны ...мацца вайсковай справай.

...ыя, хто не жадае і ўхіляецца вайсковага навучаньня, выключаюцца з радоў КСМ“,—такі загад ...аў Віцебскі губком у маі 1919 г. ...омсамольцы разам з усімі рабочымі ...кіраўніцтвам комуністычнай ...тыі сваімі грудзьмі адстойвалі ...ок за крокам Савецкую Беларусь ...наступаўшых белапольскіх войск.

Асабліва вызначаецца ў гісторыі комсамолу славутая гэройская бойка віленскіх комсамольцаў. У красавіку 1919 году яны амаль тры дні біліся на вуліцах Вільні з моцным белагвардзейскім атрадам. Комсамол кідаўся на ўсе франты, выходзіў на перадавыя позыцыі, нямала гэрояў паклалі свае галавы за Савецкую Беларусь.

„Красный Факел“ заклікаў на барацьбу комсамольцаў і рабочую моладзь супроць абшарнікаў і капіталістых. Мобілізацыі на розныя франты праходзілі з вялікім уздымам.

Пад напорам белапольскіх сіл Чырвоная армія прымушана была адступіць.

Польскія легіёны пачалі наводзіць „парадкі“ у гарадох, мястэчках і вёсках, уланскія бізуны гулялі па сьпінах рабочых і сялян, але яны не змаглі задушыць рэволюцыю.

З першых-жа дзён окупацыі парт‘організацыі, а за імі і комсамольскія пачалі працаваць у падпольлі. Асабліва шырока была разгорнута падпольная праца ў Менску.

Комсамольскія ячэйкі ў окупаваных гарадох і мястэчках праводзяць работу па распаўсюджваньню лістовак і „Факел Комунизма“, які ў той час выходзіў падпольна.

Нядоўга цягнулася панаваньне белых.

11 ліпеня 1920 году Чырвоная армія вызваляе Савецкую Беларусь ад белапалякаў.

24 верасьня г. г. склікаецца першы зьезд комсамолу Беларусі.

На гэтым зьезьдзе выносіцца пастанова выдаць на Беларусі юнацкую комсамольскую газэту. І ў 1921 годзе да другога зьезду ЛКСМБ выходзіць першы нумар газэты „Чыр. Зьмена“, якая нага ў нагу з комсамолам і партыяй становяцца ў першых радох барацьбітоў за аднаўленьне народнай гаспадаркі Беларускай Соцыялістычнай Савецкай Рэспублікі. Газэта кліча комсамольцаў, рабочую моладзь на суботнікі, на дапамогу пацярпеўшым ад галадоўкі на Волзе.

У момант уступленьня Савецкага Саюзу і ў тым ліку Савецкай Беларусі ў рэконструкцыйны пэрыод, газэта па-баявому пераключаецца на гэты адказны фронт. З ростам газэты цесна зьвязана жыцьцё кожнай комсамольскай ячэйкі, кожнай комсамольскай організацыі.

Газэта становіцца організатарам, дапамагае комсамольскім ячэйкам і організацыям у барацьбе за выкананьне дырэктыў партыі па пераварэньню БССР з краіны аграрнай у краіну індустрыяльную. **Х.**

Факел Коммунизма

МОЛОДЕЖЬ БЕЛОРУССИИ

Першыя нумары газэт КСМ Л і Б. Зьлева: Зайдэнвар—організатар менскага комсамолу. Справа: Ахманаў—першы старшыня ЦК КСМ Л і Б.

Вітаем з дзесяцігодзьдзем існаваньня газэты. Жадаем у далейшым яшчэ больш узмацніць барацьбу за генэральную лінію партыі, за падвышэньне ролі друку ў барацьбе за соцыялізм.

Бюро колектыву КП(б)Б і ЛКСМБ—рэдакцый цэнтральных газэт і друкарні „Зьвязда“

РАВЕСЬНІКІ

Калман Штэйман складвае рукі трубкай, прыстаўляе іх да вуснаў і гучна, на ўвесь свой хрыпаваты, але рэзкі голас, крычыць:

—Організацыя, слухай! Зважай! Кро-о-кам...

Нізенькі Штэйман стаіць наперадзе далёка расьцягнутай калёны і нецярпліва чакае, пакуль у радох заціхнуць усялякія гутаркі і правільна пачнуць браць ногу.

— Організацыя...

Калман неяк своеасабліва можа падкрэсьліць сэнс гэтага слова. Каманды больш ніякай калёне не патрэбна. Няпрыкметна спадуць гутаркі, з сярэдніх шэрагаў вырвецца маладая песьня, бадзёрая, як сам комсамол. Калёна крочыць зусім лёгка, а зараз возьме адзін агульны крок, рытмічна спадаючы на брук.

Песьня сярэдніх ужо запаліла ўсю калёну, пачынаючы з сьцяганосца да самых апошніх радоў.

Хто-ж гэта ідзе?

Калман Штэйман, Гарадзкі раён, Ляхаўка, Акцябраўка... Ідзе Менская комсамолія.

Сьцягі і песьні нясуць друкары, дрэваапрацоўшчыкі, гарбары, мэталістыя, студэнты, чыгуначнікі.

За якімі варштатамі стаяць працоўнымі днямі дэманстранты, зусім ня цяжка адгадаць. Прабяжыце вачыма па лёзунгах і сьцягох... У гарбароў сьцяг у форме раскрою скуры... Па баках няроўныя згібы. Сьцяг блішчыць і высока плавае над галовамі. Гарбары ідуць у першых шэрэнгах Ляхаўскай раённай організацыі. „Соскінцы“ (профшкола імя аднаго з сакратароў ЦК ЛКСМБ таз. Соскіна), першы завод, другі, трэці... Уся Ляхаўка ўсеяна маленькімі, саматужнымі заводзікамі. Гарбары пасланы на дэманстрацыю з усіх заводаў.

У іх радох вы бачыце Сёмку Пілітовіча, Лёўку Шыфа, Фрыдмана...

Чаму хлопцы вынесьлі на вуліцу песьню? Чаму калыхаюцца сьцягі, высока ўзьнятыя ўверх?

Сёньня адзін з самых гарачых дзён у годзе,—сусьветны юнацкі...

Калёна менскіх комсамольцаў выпліла на вуліцу паказаць свой рост, свае сілы, сваю бадзёрасьць і перамогі.

У які-ж-жа гэта адбываецца годзе?

Адкажам датамі з комсамольскай гісторыі. „Факел Комунизму“—першы легальны орган гарбарскіх комсамольскіх слоў ужо стаў бібліографічнай рэдкасьцю.

Тры гады пазад пачала выходзіць „Красная Смена“, чатыры невялічкія паласкі якое прагляпаліся цалкам з трапнасьцю, з неапрэпеным усёй рабочай моладзьдзю.

... Упоўдзень дэмонстрацыя разыходзіцца і гарбары, зьбіраючыся групай, ідуць на Ляхаўку, у цэхі сваіх заводаў. Сёньня ў „Смене“ пішуць аб соскінцах і хлопцы, разгарнуўшы сьвежыя шпальты толькі што аддрукаванай газэты, чытаюць гучна артыкул, спускаючыся ўніз па Ленінскай.

У Олікера і Розэнблюма, у іх „Нарысах па гісторыі комсамолу Беларусі“, 1918 год-гэта дата вытоку, нараджэньня беларускай комсамоліі. Гарбары ў гісторыі комсамолу Беларусі па праву займаць адно з пачэсных месц.

Цяжка дакладна сказаць аб днёх першых комсамольскіх сходаў ячэек менскіх гарбароў. Але ўжо ў 1921 годзе Сёмка Пілітовіч скалачваў на першым дзяржаўным гарбарным заводзе ячэйку, якая супольна з маленькай партыйнай організацыяй склала касьцяк будучых змагароў за пролетарскі Менск, за індустрыяльны Менск за чырвонаштандарны „Бальшавік“.

Недарэмна сходзяцца дзьве даты.

Першых нумароў „Красной Смены“

Першых сходаў комсамольцаў—гарбароў—1921 год.

У барацьбе ня толькі гарбароў, а ўсёй тысячнай організацыі Беларускага комсамолу „Смена“ заняла шарэнгі перадавога змагара.

І песьні яе, і лёзунгі, заклікі—чула падхопліваліся ўсёй комсамольскай калёнай.

У год калі „Красная Смена“ дзе-ні-дзе першую старонку аддавала зводкам з франтоў, якія трывожнымі маланкамі перасякалі ўсю Савецкую Беларусь лепшы гарбар Эфроімскі, а з ім і другія ўзбройваліся і ішлі у Чырвоную армію.

* * *

Гарбарныя заводы былі маленькія. Яны знаходзіліся ў старэнькіх, драўляных будынках, цёмных, сырых, пабудаваных капіталістамі шмат год назад бяз клопату аб здароўі гарбароў.

Да старых будынкаў зараз рабілі прыбудовы, прабівалі новыя вокны, устанаўлялі шумныя вэнтыляцыйныя пропэлеры, але ўсё роўна ў цэхах было цёмна і цесна.

Ячэйка комсамольцаў-гарбароў, а іх тады ўжо было некалькі, зьбіраліся ў профшколе, у клюбе, абгаварвалі політычныя пытаньні, вытворчыя, бытавыя, вучэбныя.

У ячэйках тады пачыналі расьці будучыя дырэктары, тэхнікі, майстры, партработнікі, журналістыя, кваліфікаваныя рабочыя, актывістыя, якіх потым так шчодра даў комсамольскі колектыў гарбароў.

Самай популярнаю кнігай была „Азбука Коммунизма“, якую чыталі то супольна на ячэйцы, то групамі па дамох... Часта наладжвалі суботнікі. Вечарамі зьбіраліся ў КІМ'е клюбе, цесна зьвязаным з гісторыяй усёй Менскай організацыі.

Заседжваліся ў чытальні, сьпявалі ў фойэ, горача выступалі ў залі. Гэта былі кіпучыя, незабыўныя вечары.

У чытальні ў руках шалесьцела „Красная Смена“, рэдакцыя якое потым заснавалася тут-жа, у клюбе КІМ'у на ніжнім паверсе, а пакуль знаходзілася невядома дзе.

... Соня Фрай—рэдактар „Красной Смены“, між іншым яна-ж усё: праўшчык, сэкратар, выпускаючы,—часта ходзіць на Ляхаўку.

Гарбары-перадавая колькасьць насельніцтва цэхаў Ляхаўкі, і „Смена“ шмат піша аб іх. Шмат, асабліва аб школе імя Соскіна, школе, якая за 5 гадоў свайго існаваньня дала некалькі выпускаў кваліфікаваных гарбароў.

* * *

„Факел Коммунизма“, „Красная Смена“, „Чырвоная Зьмена“—вехі на вялікім шляху росту, якімі адзначаны і шляхі росту гарбароў.

Ужо ня толькі суботнікі сталі формай выхаваньня барацьбы. Да чаного прышоў кваліфікаваны комсамолец, які хутка будзе ініцыятарам ударніцтва і спаборніцтва.

4 маленькія драўляныя заводы зрабіліся нясьцерпнымі для Ляхаўкі. Горача абгаворваецца пабудова новага гіганта, комсамол актыўна падтрымаў гэтую ініцыятыву. Утвараецца спэцыяльная камісія па будаўніцтву, у якую ўваходзіць і прадстаўнік колектыву.

Вось зьмерылі плац, вось зьвезьлі першыя матар'ялы, выкапалі катлаван.

Так быў закладзен „Бальшавік“, чырвонаштандарны завод, нераўнокца гара ых вытворчых боек.

Амаль 80 комсамольцаў пакінулі ў гэты час завод,—тыя хто прайшоў практычную школу на фронтах пад абстрэлам кулямётаў, у падпольлі, у цэху; пашлі, вырашчаныя комсамолам, на адказную гаспадарчую, партыйную, профэсыянальную, савецкую працу. Эфроімскі—дырэктар заводу, Кантаровіч—старшыня заўкому, Пілітовіч—будучы тэхнік. Фрыдман—сакратар партколектыву, Штэйман—старшыня ЦП саюзу гарбароў.

А тыя, што засталіся ў новых прасторных высокіх карпусох, не здаюць позыцый, заваяваных баявым дзесяцігодзьдзем.

... У строгаляў, побач з старым Клюксам, працуе комсамолец Кантар. Клюкс састарыўся на заводзе, у дзень дае 300 аўчын, Кантар—400. Комсамольцы накшталт буксірнага параходу.

Гефэн—сакратар комсамольскага колектыву гарбароў, член бюро ЦК ЛКСМБ—на заводзе вырас. Вось ён ва чонак, вось спартак, вось піонэр, комсамолец. Гэфэн—галава вытворчага колектыву гарбароў—аб сваіх хлопцах кажа:

— У цэху, як чэрці...

* * *

10 год „Чырвонай Зьмены“, 10 год колектыву „Бальшавіка“.

— Організацыя, зважай! У новыя пяцігодкі крокам—арш!

Успыхваюць песьні ў калёнах, запальваюць рады.

Яфім Садоўскі.

МАРШРУТ НА ПРАВА НОВЫХ ПЕРАМОГ

БРЫГАДЫ СТАРЫХ КОЛГАСЬНІКАЎ,— У ПАХОД ЗА КОЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ!

ТЫСЯЧАМІ НОВЫХ УДАРНІКАЎ СУТРЭНЕМ ДРУГУЮ БАЛЬШ...

КОЖНЫ ДЗЕНЬ, КОЖНАЯ ГАДЗІНА ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХ

БАЯВЫМ ШТУРМАМ АХОПЛЕН ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН

БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ ...

БАРАЦЬБА ЗА УМАЦАВАНЬНЕ КОЛГАСАЎ, ЗА НОВЫ КОЛГАСЫ

Ліквідуем абязьлічку ў колгасах!

Лельчыца будзе раёнам мяса і малака

Комсамольскія калёны разгарнуліся ў маршу за спэцыялізацыю раёну

Лельчыцкая спэцыялізаваная брыгада „Чырвонай зьмены“ 19 сакавіка ўключылася ў рашаючы бой за спэцыялізацыю раёну.

У Лельчыцкім раёне вырашэньне мясной проблемы і разьвіцьцё жывёлагадоўлі ганебна зрывалася. Райкоопсаюз, Райколгассаюз, РВК і РК КП(б)Б не праявілі патрэбнай для гэтага гнуткасьці, не мобілізавалі актыўнасьці мас.

Адстаючых—у калёны перадавых

Кантрактацыя малака ня была наладжана. Райкоопсаюз ня склаў дагавары на кантрактацыю малака з колгасамі і аднаасобнікамі. Кантрактацыя яравых пасеваў праходзіла зусім марудна. Агульны процант колектывізацыі раёну дасягаў усяго толькі 11,57.

У раёне ня было ніводнага юнкораўскага паста, ці брыгады. У сувязі з гэтым, перад спэцыялізаванай брыгадай паўсталі складанейшыя баявыя задачы па організацыі масавага паходу ўсёй грамадзкасьці раёну за 100% выкананьне ўсіх раённых плянаў, за вядучыя, высока-таварныя галіны і культуры данага раёну, за разгортваньне барацьбы, за пераход раёну з калён адстаючых у калёны перадавых.

Як-жа выкананы гэтыя задачы?

Адразу-ж была мобілізавана ўвага ўсёй грамадзкасьці раёну вакол працы спэцыялізаванай брыгады, шырока разгорнута практычная работа, праведзены масавыя сходы, ставіліся даклады, шырокія комсамольскія масы і працоўная беспартыйная моладзь знаёміліся з мэтамі і з задачамі спэцыялізаванай брыгады.

У дапамогу брыгадзе было мобілізавана 30 лепшых комсамольцаў з раённага актыву, 40 вясковых комсамольцаў, усе працаўнікі РК ЛКСМБ, а таксама ў працы брыгады прынялі самы гарачы ўдзел усе комсамольскія ячэйкі раёну і беспартыйная моладзь.

Паказчыкі выкананьня павялічыліся

Комсамольская організацыя ўзяла шэфства над маладняком і лепшай гадоўляй жывёлы. У справе контрактацыі цялят і малака зроблены значныя зрухі. Гурт буйнай рагатай жывёлы ўкомплектаваны на 90%. Агульны процант контрактацыі яравых пасеваў па раёне дасягнуў 94,7 выкананьня, па колгасах—на 50% з прычыны паўнейшай адсутнасьці контрактацыі да прыезду. Кантрактацыя тэхнічных культур выканана на 161%, крупянічных—на 127%, ячменю на 79%, бульбы на 78,1%, аўса на 65%.

Агульны процант колектывізацыі раёнаў павялічыўся на 10,23 і дасягнуў ужо 21,8%, а ў паасобных сельсаветах, як напрыклад, Астражанскім, з 28,7% дасягнуў 42,5%, Гребянёўскім—з 22,17%—да 32,9%.

67 новых юнкораў, 73 комсамольцы, 5 ячэек.

У 17 пунктах раёну організаваны юнкораўскія пасты і брыгады, якія аб'ядналі 67 чал. юнкораў, таксама актыўна дапамагаўшых спэцыялізаванай брыгадзе.

Па раёне, у гонар 10-гадовага юбілею „Чырвонай зьмены“, быў абвешчаны чырвоназьменаўскі набор у комсамол, які даў 5 новых комсамольскіх ячэек, 73 батракоў і беднякоў-колгасьнікаў прыняў комсамол у свае баявыя калёны.

Організаваны новы колгас „КІМ“ з 30 гаспадарак. Гэта лепшы колгас ва ўсім раёне, і зараз ужо ўся вёска цалкам увайшла ў яго. Організавана прыгарадная гаспадарка сіламі комсамольцаў, шляхам суботнікаў і адпрацоўкі выхадных дзён.

Разгорнутай калёнай—за спэцыялізацыю

Уся комсамолія раёну была мобілізавана на барацьбу за спэцыялізацыю. Па раёне шырока разгарнулася ўдарніцтва і соцспаборніцтва. Былі складзены соцумовы між паасобнымі брыгадамі, комсамольскімі ячэйкамі, колгасамі. Ва ўсіх колгасах раёну ўстаноўлены нормы выпрацоўкі, ліквідавана абязьлічка, уведзена зьдзельшчына.

Праведзена шырокая агульнараённая масавая праверка падрыхтаванасьці колгасаў і аднаасобнага сэктару да вясеньняй сяўбы. Організавана ачыстка насеньня, рамонт сельскагаспадарчага інвэнтара. Дзякуючы гэтаму, амаль усе колгасы сваячасова скончылі рамонт інвэнтара і ачыстку насеньня. Праведзена вялізарнейшая праца па організацыі пробных выхадаў колгасаў у поле. Быў складзен плян правядзеньня пробных выездаў—праверыць гатоўнасьць колгасаў да севу. Па вёсках і колгасах былі організаваны ініцыятыўныя групы і брыгады з комсамольцаў і колгасьнікаў па праверцы падрыхтаванасьці да сяўбы і вярбоўцы ў колгасы. У політгуртках і школах уведзены гадзіны вывучэньня агро-зоотэхнікі.

На дасягнутым не супыняцца

Спэцыялізаванай брыгадай было праведзена звыш 24 рэйдаў юнкораўскіх брыгад, 60 дакладаў аб спэцыялізацыі раёну, аб юбілеі „Чырвонай зьмены“ і інш. пытаньнях. Лельчыцкі раён значна падцягнуўся, перабудаваў сваю працу, перавёўшы яе на ўдарныя, сапраўды бальшавіцкія тэмпы.

Віт. Сідарук.

Ударнік-юнкор Прыбытак Ян.

Каб практычна дапамагчы комсамольскім організацыям рэалізаваць лёзунг партыі аб спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, узьняць тэмпы колектывізацыі у спэцыялізаваных раёнах і рэалізаваць лёзунг ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены“: „за опэрацыйны плян спэцыялізаваных ўдараў; за вядучыя высокатаварныя галіны і культуры сельскай гаспадаркі“,—газэта „Чырвоная Зьмена“ організавала тры спэцыялізаваныя брыгады.

Брыгады былі накіраваны для практычнай дапамогі комсамольскім організацыям Гомельскага, Лельчыцкага і Лёзьненскага раёнаў і працавалі там на працягу месяцу. Якія-ж вынікі іх практычнай працы? На гэта дае адказ зьмешчаны сёньня матар'ял.

БАЯВОМУ ЮБІЛЯРУ

Любімай баявой газэце у дзень яе 10-гадовага юбілею комсамолія Лельчыцкага раёну, ударная комсамольская юнкораўская брыгада імя 10-годзьдзя „Чырвонай Зьмены“ юнкораўскія пасты і юнкоры шлюць шчырае комсамольскае вітаньне.

Агульнымі сіламі пры дапамозе рэдакцыі ліквідуем усе прарывы заваюем раёну годнасьць ўдарнага, дапаможам яму канчаткова выйсьці з калён адстаючых і стаць у калёны перадавых.

Шчыра дзякуем цябе, дарагая „Чырвонка“ і вітаем тваю ідэю па накіраваньню ў наш адстаючы раён спэцыялізаванай брыгады якая практычна дапамагла нам організаваць масы, разгарнуць пасьпяховую барацьбу за спэцыялізацыю раёну.

Юнкоры-ўдарнікі „Чырвонай Зьмены“



Унізе: Фота-юнкораў кая брыгада школы ФЗВ. Зьверху: зьлева направа Я. Гінзбург, Міхась Ракіта П. Цыра і Міхась.

ГОМЕЛЬСКАЯ КОМСАМОЛІЯ ШТУРМУЕ ПРАРЫВЫ

Прыехаўшы ў Гомель, спэцыялізаваная брыгада „Чырвонай Зьмены“ сустрэла такое становішча: „Палеская праўда“ штодзенна біла трывогу аб пагрозе, якая стварылася ў падрыхтоўцы да севу прыгараднай гаспадаркі.

Штаб, вылучаны пры гаркамоле для кіраўніцтва штурмам, бязьдзейнічаў.

— Так працаваць далей нельга, заявіла спэцбрыгада.—

Па закліку і ініцыятыве „Чырвоназьменаўскай“ спэцыялізаванай брыгады, гомельская комсамолія пайшла на штурм прарываў.

Да гадавіны „Ч. З.“ ліквідаваць прарывы

Вылучаны бюро гаркамолу штаб па кіраўніцтву штурмам за бязьдзейнасьць быў распушчаны.

Склікалі нарады вясковых сэкратароў комсамольскіх ячэек, сэкратароў гарадзкіх колектываў і паставілі задачу:

— Да гадавіны „Чырвонай зьмены“ ліквідаваць прарывы.

Былі мобілізаваны 40 раённых актывістых—комсамольцаў для дапамогі прыгараднай гаспадарцы. Яны на мясцох разгарнулі значную працу і сваімі сіламі організавалі два колгасы — адзін імя „Чырвонай зьмены“ з 24 гаспадарак, другі—імя „Гомельскага комсамолу“ з 32 гаспадарак і організавалі магутны прыліў у старыя колгасы.

У выніку такой працы, процант колектывізацыі па раёне ўзьняўся за месяц з 9,1 да 15,1 проц.

Малайцы, хлопцы, добра працуюць

Па ініцыятыве спэцбрыгады організоўваюцца і пасьпяхова праводзяцца пасеўныя трывогі гарадзкіх комсамольцаў па дапамозе прыгараднай гаспадарцы.

Комсамольскі колектыў заводу „Пролетары“ адпрацаваў на полі па пасеўтрывозе больш 300 чалавека-гадзін, абвясьціўшы ўдарную пяцідзёнку па вывазцы гною. ФЗВ чыгуначнічнікаў даў 1924 чалавека-гадзін, ЦРК—больш за 500, Сампрам—больш 400 і г. д.

Комсамольцы працавалі на ўсіх вучастках. Вазілі і раскідалі гной, ачышчалі ад сьнегу плошчу для парніковых рам, закладалі і ачышчалі ад матаў рамы.

Юнкоры—актыўнейшыя барацьбіты за сеў

За час працы спэцбрыгады у Гомельскім раёне былі праведзены чатыры рэйды ўдарнікаў „Чырвонай зьмены“, у якіх удзельнічала больш 50 чалавек, яны правяралі як гарадзкія колектывы дапамагаюць прыгарадным гаспадаркам ліквідаваць прарывы.

Ударнікі-брыгаднікі „Ч. З.“ давалі практычныя ўказаньні колектывам як трэба дапамагчы прымацаванаму да іх вучастку.

На заводзе імя Ланцуцкага нічога не рабілі пакуль ня прышла брыгада ўдарнікаў „Ч. З.“ А пасьля рэйду завод тэрмінова праклаў да саўгасу вузкакалейку гной быў вывезен.

На іншых прадпрыемствах было тое-ж самае: пасьля рэйду наступаў зрух у працы.

Расьце ўдарны рух юнкораў

Організавалі на прадпрыемствах, у саўгасах і колгасах 14 ударных брыгад, якія разьбіліся на юнкораўскія пасты.

Юнкораўскай працай ўжо зараз ахоплена 115 ударнікаў. За асноўную юнкораўскую працу яны лічаць—працу ў насьценгазэце, ці шматыражцы. Напрыклад, юнкоры заводу „Пролетары“ пачалі сыстэматычна выпускаць у шматтыражцы комсамольскі аддзел, юнкоры Сельмашу выпускаюць ударную зубастую насьценгазэту „Трывога“ ударнікі-юнкоры ФЗВ чыгуначнікаў, „Клары Цэткін“, „Рухавік рэволюцыі“, „Мэліотрэсту“ „ЦРК“ і г. д. зьяўляюцца членамі рэдколегіі актыўна ўдзельнічаюць у шматтыражках і насьценгазэтах.

Вось кароценькі малюнак праробленай працы гомельскай спэцыялізаванай брыгадай „Чырвонай Зьмены“.

Зараз, каб працягнуць працу, пачатую спэцбрыгадай, бюро гаркамолу вылучыла спэцыяльную брыгаду з трох асоб. Задача яе, асабліва зараз, у час веснавога севу шырока разгарнуць сваю працу і асьвятліць яе на старонках „Чырвонай Зьмены“.

Цішка Верны.

Рапартуе

Лёзьненская спэц[ыя]лізаваная брыгад[а]

„Чырвоная Зьмена“, як адзі[н з] баявых лёзунгаў палепшаньня [ра]боты ў колгасах, узьняцьця в[ы]творчасьці працы, працоўнай [ды]сцыпліны, зьмяншэньня растрат[ы] проценту амортызацыі ў сельск[ай] гаспадарцы, высунула лёзунг: „[Лі]квідаваць абязьлічку ў колгасах [і] саўгасах на ўсіх зьвеньнях работы“.

Для практычнае дапамогі „Чы[р]вона Зьмена“ паслала сваю бр[ы]гаду ў колгас „Бязбожнік“, Лё[зь]ненскага раёну. Гэты колгас [...] ўзялі з тым, каб зрабіць яго ўзо[р]ным, вопытна-паказальным.

Брыгада „Чырвонай Зьмены“ разам з праўленьнем і вытворч[ай] нарадай колгасу, перарабіла пля[н], конкрэтызавала яго да дробязя[ў]: колькі і якіх культур будзе сея[ць] колгас, у якім парадку. Выходзя[чы] з гэтага, устанавілі: якія культу[ры] будзем сеяць раней, колькі дзён [на] якой брыгадзе трэба для правя[]дзеньня тае ці іншае працы, [і] якую работу перакідаецца брыгад[а].

Распрацавалі плян ліквідац[ыі] абязьлічкі, да кожнага колгас[ь]ніка прымацавалі плуг, каня і г. [д.] на пэўны абмежак часу. У абор[ы] да кожнай даяркі прымацавалі пэ[ў]ную колькасьць кароў, да кожна[га] конюха пэўную колькасьць коня[й].

Брыгада дапамагала колгасу ор[]ганізаваць, наладзіць работу вытво[р]чых нарад, ператварыўшы іх у б[а]явы штаб работы колгасу.

Абвясьцілі ўнутрыколгасны р[а]цыяналізатарскі паход, увялі рац[ы]яналізацыю дастаўкі корму і ка[р]мленьня жывёлы.

Організавалі тры брыгады з кол[]гасьнікаў для збору прапаноў [па] жывёлагадоўлі, па паляводству і [па] агульных пытаньнях колгаснае вы[]творчасьці. Брыгада з 35 чалаве[к] колгасьнікаў актывістых пайшл[а] для організацыі колгаснага прылів[у] ў сяло Пунішчы.

Самі колгасьнікі простай мовай перакануўчымі фактамі давялі ад[]наасобнікам перавагу колгаснае пра[]цы. Аднаасобнікам ня было ў чы[м] супярэчыць. У гэты вечар 25 гаспа[]дарак з 32-х сталі на шлях кол[]гасаў і раніцою прыступілі да ра[]боты.

Колгас абвясьціў чырвоназьменаў[]скі заклік колгасьнікаў у рад[ы] ўдарнікаў і даў 40 новых ударні[]каў да 10-гадовага юбілею. Ус[е] колгасьнікі ахоплены соцспаборніц[]твам і ўдарніцтвам, кожная брыга[]да мае дагавары і конкрэтныя аба[]вязкі. Выходзячы з рацыяналізатар[]скіх прапаноў, пераводу ўсіх рабо[т] на зьдзельшчыну, павялічэньня нор[]мы выпрацоўкі, колгас вынес па[]станову—скараціць тэрміны севу на 5 дзен.

Так практычна „Чырвоная Зьме[]на“ дапамагала колгасам ажыцьцё[]віць высунуты лёзунг. **Г. Логвін**

Ударнік-юнкор К. Кароль

КОЖНАЙ ЛІТАРАЙ КАВАЦЬ ЖЫВЫЯ СПРАВЫ КОМСАМОЛУ!

Бязупынна, дзень у дзень, хвіліну за хвілінай змагацца за генэральную лінію партыі, за трэці рашаючы, за тэмпы плюс якасьць

Штодзённай праверкай, бальшавіцкай самакрытыкай, выкрываючы недахопы, змагацца за канчатковую перамогу соцыялізму



...а здаровы паравоз

...тодзённае спазьненьне цяг...ў... Вялікая чарга паравозаў ...рамонту ў дэпо... Паломкі, ...обкі", затрымка сыравіны для ...ыялістычных прадпрыемст...—вось нядаўнае мінулае чы...гуначнага транспорту.

...Нэрвы краіны павінны быць ...арушнымі",—сказала партыя ...рад. „Чырвоная Зьмена" на ...ктычных справах мобілізуе ...самольскую рганізацыю на ...ідацыю прарыву.

...Клобін—паказальны вучастак

...кразная комсамольская бры...а імя 10-га зьезду ЛКСМБ ...азала сапраўды бальшавіцкія ...ы ў працы. Па яе прыкладу ...адаюцца яшчэ дзьве брыгады ...рганізав па плянава-опэра...ная група, першая на чы...ачных вузлах у БССР.

...на даводзіць прамфінплян ...варштату, ажыўляе яна ...кі вымернікаў і пачынае ...к за крокам займаць адно ...ершых месц у рабоце дэпо, ...араноз № 643 быў адным ...ых, на якіх абязьлічка наклала ...й амаль нязмыўны адбітак, ...араз... зараз ён комсамоль...-цягніковыя брыгады-комса...ьцы, шэф—комсамольскі ко...тыў, а паравоз здаровы.

...ак, жлобінская комсамолія ...і актыўнай дапамозе „Чырвонай Зьмены" ажыцьцяўляе сваю мэту, ператвараючы Жлобін у паказальны комсамольскі вучастак.

Так ідэі становяцца „фактамі".

А ў Віцебску комсамольскі паравоз сэрыі ШЧ, № 422 імя „Чырвонай Зьмены", які абслугоўваецца дзьвума комсамольскімі брыгадамі, за 52 дні ня меў ніводнай хвіліны спазьненьня. Так рапартуюць „Чырвонай Зьмене" комсамольцы Мартыенка, Дзяркач, Кавалёў, Казарынаў, Скорабагатаў і Макараў, якія працуюць на гэтым паравозе.

Практычнымі справамі комсамолія чыгункі ажыцьцяўляе загад партыі робіць нэрвы краіны непарушнымі.

* * *

За конвэер якасьці

„...За асобны ўдарны квартал Віцебская абутковая фабрыка страціла на бракаваным абутку 44.193 рублі. Штамповачны цех Віцебскай гарбарні імя Ялісеева дае дрэнна замацаваныя абсацы..." (з матар'ялаў ударнай брыгады газэты „Рабочий".

Даёш якасьць!

На фабрыцы с вараецца конвэер якасьці, які: „павінен ахапіць усе процэсы гарбарнай вытворчасьці... Рабочыя па прынцыпе соцыялістычнага спаборніцтва, узаемнымі дагаварамі павінны дамагацца лепшай якасьці прадукцыі..."

Гэты заклік комсамольцаў фабрыкі Лекерта, якія сумесна з „Чырвонай Зьменай" высунулі ідэю організацыі конвэеру якасьці, прайшоў хваляй па ўсіх прадпрыемствах гарбарнай прамысловасьці і закрануў сярнічковыя фабрыкі Беларусі.

— Даёш конвеер!
сказаў „Бальшавік",
завод „Ялісеева",
абутковая менская ф-ка
і Гомельскі „Труд".

Узаемныя дагаворы, змаганьне за лепшую якасьць далі посьпехі. Завод Бальшавік, выйшаў з паласы прарываў пераможцаю, менская абутковая абвясьціла паход за тэхніку, гомельскі „Труд" абвясьціў штурм.

Уключыць соцыялістычныя прадпрыемствы ў скразны соцыялістычны конвэер якасьці, ператварыць яго ва ўсесаюзны паход комсамолу за якасьць—у гэтым задача сёньнешняга дня.

За плянам

* * *

За ударніка--плянавіка

„—Плянава-опэрацыйная група гэта—наша апора,—кажуць майстры заводу „Полымя рэволюцыі".—Мы-ж без яе ніводнага мерапрыемства не праводзім"

Народжаная па ініцыятыве „Чырвонай Зьмены" і заўтрашніх спэцыялістых, студэнтаў наргасу БДУ—плянава-опэрацыйная група практычнымі справамі заваявала аўторытэт усяго заводу.

Дзяржплян ля варштата цесна зьвязаны з Дзяржплянам БССР, яны—актыўныя ўдзельнікі чысткі яго, яны—будучыя кваліфікаваныя плянавікі.

Рапартуючы аб выніках ударнага квартала, комсамольскі колектыў заводу „Комунар", які атрымаў пераходны сьцяг імя ЦК ЛКСМБ, апавядаў аб героічнай рабоце плянава-опэрацыйных груп. Яны былі аднымі з першых у барацьбе за атрыманьне ганаровага сьцягу.

Плянаваньнем ля варштата яны ажыцьцяўляюць вялікую ідэю Леніна: „Соцыялізм—гэта плян".

* * *

За тарпяны Донбас

ЦК ЛКСМБ і яго орган „Чырвоная Зьмена", заручыўшыся думкамі раду спэцыялістых і думкай аўторытэтнейшых організацый, высоўваюць перад грамадзкасьцю, перад комсамольскімі організацыямі два асноўныя, вядучыя лёзунгі:

Першы: ператварыць Беларусь у тарпяны Донбас.

Другі: к канцу пяцігодкі—усю прамысловасьць на тарпяны апал.

За рэалізацыю гэтых лёзунгаў комсамол і „Чырвоная Зьмена", пад кіраўніцтвам партыі, разам з ВСНГ, Дзяржплянам, Белторпам, будуць жорстка змагацца. (З выступленьня тав. Платава).

Донбас патрабуе кадры.

На тарпяны фронт мобілізуецца комсамольская „тысяча".

Мобілізацыя праходзіць марудна, паасобныя організацыі недаацэньваюць значэньня торфу.

Насіс уць, узяць тэмпы, перавыканаць кантрольныя лічбы. Б'ём адстаючых, паказваем перадавых. Комсамольская „тысяча" будзе!

Торп заменіць лес і вугаль, бо:

— Нараджаецца новая
качагарка Саюзу:
Беларусь—
тарпяны Донбас!

НАШ ПАСЫЎ

10-цігадовы шлях—гэта шлях барацьбы, перамог і паражэньняў. Гэта шлях доўгай і ўпартай барацьбы.

Аб нашых паражэньнях.

Яны дваякія. Шмат пытаньняў узьняла газэта, але не давяла да канца. Шмат спраў пачалі тварыць і ня скончылі.

Аб першых.

Узьнятая барацьба за плян, упартая бойка за правільнае разуменьне і кіраўніцтва плянава-опэрацыйным рухам (справа БДУ), якое была раней, за апошні час значна аслабла. Гэты вучастак работы запушчан.

Прапановы аб мобілізацыі тысячы комсамольцаў на торпаздабычу, аб выпуску пазыкі „ператварыць Беларусь у тарпяны Донбас" падхоплены і падтрыманы пастановай бюро ЦК ЛКСМБ.

Але газэта яшчэ не дабілася 100 процантнай рэалізацыі гэтых прапаноў. Яны яшчэ ня сталі жывымі справамі. За гэта трэба змагацца!

Прапанова аб разгортваньні працы па канвэеру якасьці падхоплена, і конвэер ідзе поўным ходам.

Апошнія дні прыносяць зьвесткі аб тым, што паасобныя зьвеньні пачалі здаваць позыцыі, а гэта тармозіць працу скразнога соцыялістычнага. Радзіма яго—Віцебская абутковая фабрыка—пайшла на ніз. За гэта мы ў адказе!

Мы слаба змагаліся за замацаваньне занятых позыцый.

Зараз аб другім.

У час 10-цігодзьдзя ФЗВ, „Чырвоная Зьмена", якая ўвесь час змагалася за ФЗВ, як асноўную, бальшавіцкую форму падрыхтоўкі кадраў высунула прапанову правесьці ўсебеларускі суботнік дапамогі ФЗВ.

Ідэя была падхоплена і на мясцох суботнікі праведзены. Але організаваны ўсебеларускі суботнік быў правалены. Гэта наш пасыў.

Ідэя аб пераклічцы адсталых вучасткаў пачала ператварацца ў жыцьцё, але газэта дала толькі адну падборку па пераклічцы і гэтым абмежавалася. Гэта наш недахоп.

Былі і другія. Але ў штодзённай упартай бойцы цяжка выйсьці без ахвяр. Надалей—яшчэ больш

Зіркасьці, опэрацыйнасьці і мэтнасьці!

І ўсё гэта на справу партыі Леніна. Такі наш дэвіз!

Газэта у штодзённай бойцы--зброя, куецца самым байцом

.. У поўдзень, пасьля працы ...прыходзіць у пакой рэдак...і. Маленькі допіс: „У цэху ...парадкі".

Ён больш піша аб непарад..., менш аб іншым.

Ён друкуецца ў газэце.

Дазвольце, ён журналіст? ...працоўнік пэсы?

Выбачайце. Ён юнкор, юнударнік.

Крычэўскі—вучань будвучу, ...самолец, ударнік, апорг ...мсамольскай ячэйкі.

Пачаў пісаць выпадкова. У ...коле, што рыхтуе кваліфікаваных рабочых для будаўніцтва, было шмат непаладак. ...пісаў допіс, допіс быў на...друкаваны.

Пытаньне ўзьнята на ячэйцы, у адміністрацыі, у вучнёўском камітэце, і... пайшла бойка. ...Упарта „Чырвоная зьмена" ...бараніла недахоп будвучу. ...х вучобы быў узяты на бу... і зараз газэта змагаецца ...а моцны, ударны цэх.

Рабочы, ударнік пабудовы, ...пішу ў газэту, каб з яе дапамогай выйсьці на лінію перадавых, таму ён юнкор-удар...нік.

Таму ён штодня піша ў газэту, таму ён—актыўны ўдзельнік юнкораўскіх брыгад „Чырвонай зьмены", удзельнік на...тачаў на пабудовы.

Гельфанд — рабочы заводу імя Варашылава, комсамолец. Комсамол на гаспадарчым фронце. Комсамол разам з усёй рабочай клясай пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі—бьецца на фронце пяцігодкі.

Ён адзін з організатараў плянава-опэрацыйнай групы ў цэхах заводу імя Варашылава. Ён непасрэдны актыўны ўдзельнік працы плянава-опэрацыйных груп і таму ён ня можа ня пісаць у газэту. Таму, што ён ударнік варштату, удзельнік і організатар плянава-опэрацыйнае групы, актыўны юнкор „Чырвонай зьмены", бо газэта змагалася за плянава-опэрацыйныя групы і ён адзін з актыўных удзельнікаў гэтай барацьбы.

Таму ён ударнік. Таму ён юнкор.

Крутковіч. Комсамолец з 1924 году. З 1923 быў батраком. Пасьля 4 гады працаваў на заводзе. Зараз абраны старшынём заўкому Юнкор „Чырвонай Зьмены". Вось, што ён піша аб сабе:

„Пачаў пісаць у газэту ў 1927 г. Пісаў розныя матар'ялы аб недахопах і посьпехах свайго заводу і працы ячэйкі. Газэта дапамагала зьнішчаць недахопы, якія меліся на заводзе. „Чырвоная Зьмена" мне дапамагла ў штодзеннай працы.

Таму ён юнкор.

Таму ён—штодзенны непасрэдны ўдзельнік таго, што робіць газэта.

Непаліцкі. Жлобінскае дэпо. Ударныя брыгады на кожным паравозе. Ён адзін з многіх. Прэміяваны ўдарнік Жлобінскага дэпо.

Чыгунка—адсталы вучастак соцыялістычнага будаўніцтва.

Задача: паставіць на рэйкі соцыялістычнага транспарту здаровы паравоз.

І таму,

калі ў Жлобіне працавала выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" па штурму недахопаў, ён—адзін з актыўнейшых непасрэдных ўдарнікаў працы рэдакцыі.

Ён організатар юнкораўскіх брыгад.

Ён штурмаваў прарывы ня толькі ля варштата, ня толькі за рамонтам паравозу, ня толькі на сходзе комсамольскай ячэйкі, а на старонках газэты ішоў змагацца за ўдарныя тэмпы.

Зараз ён кіраўнік юнкораўскага паста „Чырвонай Зьмены" ў Жлобіне.

Гарэлаў. Магілеўская швэйная фабрыка імя Валадарскага.

Ударны комсамольскі агрэгат: прамфінплян выкананы.

Комсамолец Гарэлаў—член штабу комсамольскага ўдарнага агрэгату. Комсамолец Гарэлаў—адзін з тых, якія рапартуюць:

Да выкананьня задач 3-га ... ідзем ударным крокам.

Гарэлаў — актыўны юнкор „Чырвонай Зьмены". Ён паказаў комсамолі як змагаецца адзін комсамольскі агрэгат, як ён перамог, як ён крочыць да новых, большых перамог.

Юнкор-ударнік лічыць сваю працу ў газэце, свой актыўны непасрэдны ўдзел у працы друку, працягам ударнае працы ля варштата. Юнкор-ударнік.

Гэткіх шмат.

Растуць калёны ўдарнікаў, растуць калёны тых, якія ўдала...далі комуністычнымі мэтодамі працы.

А. С-л.



Юнкоры-ўдарнікі—Гельфанд, Крычэўскі, Гарэлаў і Непаліцкі.

ПЕРАМОЖНЫ МАРШ КУЛЬТУРНАЙ ПЯЦІГОДКІ

ШЫРЭЙ УДЗЕЛ КОМСАМОЛУ Ў НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВ

Павядзем новыя тысячы барацьбітоў на культурны фронт

„Чырвоназьменаўскія" шпальты на барыкадах культурнай рэволюцыі

Кастрычнікаўс і ураган зруйнаваў Расійскую Імпэрыю—агідную турму народаў і вызваліў працоўныя масы ад панаваўшага спакон веку шалёнага соцыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня.

У арсэнале жудаснай спадчыны ад царату былі няпісьменнасьць, цемра і бескультур'е.

За час існаваньня дыктатуры пролетарыяту рабочая кляса і асноўныя масы сялянства дамагліся надзвычай вялізарных перамог на фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Пролетарыят Савецкага Саюзу, разгортваючы наступленьне па ўсім фронце, выціскаючы капіталістычныя элемэнты, ліквідуючы клясу кулацтва на базе суцэльнай колектывізацыі, бязупынна крочыць па шляху новых і новых, нябачаных у сьвеце перамог. Гэтыя перамогі бліскуча здабыты ва ўмовах надзвычайна абвостранай клясавай барацьбы дзякуючы выпрабаванаму кіраўніцтву комуністычнай партыі, дзякуючы яе ленінскай нацыянальнай політыцы.

Савецкая Беларусь адна з першых рэспублік Савецкага Саюзу ў 1930 годзе ўвяла ўсеагульнае навучаньне, у шырокіх памерах разгарнула ліквідацыю няпісьменнасці і буйнымі крокамі ідзе да новых перамог.

Шырока разгорнутае соцыялістычнае будаўніцтва ва ўсёй шырыні паставіла перад партыяй проблему кадраў. І ў краіне, раней прыгнечанай і адсталай, а цяпер пасьпяхова ператвараемай у краіну індустрыяльна-колгасную, організавана 13 ВНУ, 35 рабфакаў, 81 тэхнікум, дзесяткі школ ФЗВ, школ колгаснай моладзі і іншых навучальных устаноў. Такім чынам, у самыя бліжэйшыя гады БССР зможа ў асноўным забясьпечыць усе галіны народнай гаспадаркі пролетарскімі кадрамі. У БССР ахоп дзяцей 8-11-гадовага ўзросту дасягнуў 95,98 проц.

На фронце культурнай рэволюцыі Савецкая Беларусь атрымала шматлікія перамогі. Лік дашкольных установ у апошнім годзе пяцігодкі павінен быў скласьці 788, а ўжо ў 1931 годзе будзе іх 2110 гэта значыць больш на 167 проц. апошняга году пяцігодкі. Колькасьць дзяцей у дашкольных установах у 1931 годзе будзе роўняцца 60.000 чал. або на 90 проц. больш, чым прадугледжвалася пяцігодкай. Па ўсеагульнаму навучаньню ў школах 4-х гадовага навучаньня і політэхнічных школах у гэтым-жа годзе мы ўжо маем 14.402 комплекты або 96.50 проц. усей пяцігодкі. Перавыканана таксама пяцігодка ў галіне організацыі хат-чытальнь.

Дзякуючы вялізарнай актыўнасьці працоўных мас мы дасягнулі вялікіх посьпехаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Поўная канчатковая ліквідацыя няпісьменнасьці паводле пастаноў X зьезду саветаў БССР будзе скончана ў 1932 годзе.

Зусім зразумела, што гэтыя посьпехі здабыты толькі дзякуючы генэральнай лініі партыі, ленінскай нацполітыцы, дзякуючы бязьлітаснай барацьбе з вялікадзяржаўным шовінізмам, беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі ўсіх колераў.

Ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам компартыі самаддана змагаецца на фронце культурнай рэволюцыі. Актыўны ўдзел бярэ ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Комсамол—шэф усеабучу, паказаў сапраўдныя бальшавіцкія ўзоры барацьбы на гэтым адказнейшым вучастку соцыялістычнага будаўніцтва. Праведзеным комсамолам трохмесячнік беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменшасьцяй, а таксама ажыцьцяўленьне цэлага шэрагу разнастайных мерапрыемстваў даў той вынік, што комсамолія і пад кіраўніцтвам яе рабочая і ўся працоўная моладзь сталі на шлях актыўнага ўдзелу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.



„Краіна, стала ты магутнай, маладой"...

„Чырвоная Зьмена" 10 год. У дзень юбілею асабліва важна перагарнуць шпальты старонкі ЦО ЛКСМБ для таго, каб паказаць, як газета мобілізоўвала комсамол і працоўную моладзь на барацьбу за ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі партыі, за актыўны ўдзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве, як газета змагалася на барыкадах культурнай рэволюцыі.

Трэба сказаць, што ўдзельная вага „Чырвонай Зьмены" ў нацыянальна-культурным будаўніцтве асабліва за апошнія гады значна павялічылася, што газета ў асноўным правільна і своечасова арыентавала комсамол і працоўную моладзь па пытаньнях барацьбы з нацыяналістычнымі ўхіламі, вяла рашучую барацьбу з варожымі праявамі на гэтым важнейшым вучастку соцыялістычнага будаўніцтва.

Яшчэ сьвежы ў памяці комсамольцаў і маладых рабочых масавыя экскурсіі, організаваныя „Чырвонай Зьменай" у Маскву, Ленінград, на лінкор „Парыжская Комуна" і усебеларуская „чырвоназьменаўская" экскурсія—дэлегацыя комсамолі і працоўнай моладзі Беларусі на Украіну па маршруту Гомель — Кіеў — Днепрапятроўск—Днепрабуд.

Варта ў дзень юбілею ўспомніць такія мерапрыемствы, як шырокія дыспуты па пытаньнях гегемоніі пролетарскай літаратуры, шляхох тэатру і інш. „Чырвоная Зьмена" ўзьнімала на сваіх старонках цэлы рад злабадзённых, хвалюючых пытаньняў, як напрыклад: „Комуніст Васька ці мешчанін?", „Ці варта сёньня быць поэтай?", „Ці адказваюць дзеці за мінулае сваіх бацькоў?", „Балалайку—на службу пісьменству" і інш. Газета рашуча выступіла супроць „Салаўёў новага быту", якія „на сходах прыгожа пяюць аб новым быце, а дома твораць брудныя, старыя справы".

Неабходна таксама адзначыць, што газета, організаваўшы з 15 сакавіка па 1 красавіка ўсебеларускі рэйд „чырвоназьменаўцаў" на фронт усеабучу і ліквідацыі няпісьменнасьці, не змагла наладзіць опэрацыйнае кіраўніцтва юнкорбрыгадамі і паасобнымі юнкорамі так, каб забясьпечыць патрэбныя вынікі гэтага рэйду. Ня гледзячы на гэта, клич газэты быў падхоплены і там, дзе рэйд быў праведзен, маюцца бліскучыя вынікі. Напрыклад, у Стар сельскім сельсавеце былі праведзены сходы і мітынгі ва ўсіх школах і лікпунктах аб усебеларускім рэйдзе „чырвоназьменаўцаў" на ўсеабучу і шляхам практычных мерапрыемстваў там дамагаліся бліскучых посьпехаў.

Уступаючы ў 11 год барацьбы за генэральную лінію партыі, „Чырвоная Зьмена" яшчэ вышэй узьніме сьцяг барацьбы на фронце культурнай рэволюцыі і пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ мобілізуе комсамолію і працоўную моладзь на актыўны ўдзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве.

В.

ЗАМАЦАВАЦЬ ДАСЯГНЕНЬНІ ЮБІЛЯРА

Ажыцьцявіць канкрэтныя прапановы „Ч. З."

Наборшчыкі газэты „Чырвоная Зьмена" ў дзень дзесяцігадовага юбілею „Ч. З." вітаюць слаўнага юбіляра. „Чырвоная Зьмена" на працягу свайго існаваньня па бальшавіцку мобілізавала масу комсамольцаў і рабочую моладзь на конкрэтныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва, змагаючыся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Рабочы колектыў замацуе дасягненьні газ. „Ч. З." і будзе змагацца за ажыцьцяўленьне высунутых мерапрыемстваў газэтай.

Няхай жыве Комуністычная партыя.

Няхай жыве Ленінскі комсамол.

Рабочыя наборшчыкі „Ч. З." друкарні імя Сталіна

АКТЫЎНАМУ ЗМАГАРУ ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Аддзел культуры і пропаганды Цэнтральнага Камітэту Комуніст[ыч]нае Партыі (бальшавікоў) Беларусі горача вітае адну з старэй[шых] комсамольскіх газэт Савецкага саюзу—„Чырвоную Зьмену" і яе ш[матлікую] тысячную чырвоназьменаўскую армію юнкораў і чытачоў.

...Спэцыялізаваныя ўдарныя брыгады, соцыялістычны кон[курс], якасьці, шматлікія пераклічкі, дзесяткі ўдарных брыгад друку—гэта складае жалезны арсэнал багатага вопыту масавай работы.

Хутка пачынаецца ўсебеларускі месячнік пролетарскага друку, за ім і ўсебеларускі зьезд рабселькораў.

Культпроп ЦК КП(б)Б упэўнены ў тым, што „Чырвоная Зьме[на] ў справе падрыхтоўкі і правядзеньня месячніка пролетарскага др[уку] дасьць сапраўдныя ўзоры настойлівага бальшавіцкага змаганьня за [да]лейшы рост рабселькораўскага руху і нізавога друку пад знакам [вы]каваньня пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб друку.

Неабходна яшчэ больш павысіць ролю „Чырвонай Зьмены" у бара[цьбе] за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну, пасьпяховае правядз[еньне] пасеву і падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, за ўздым новай магут[най] хвалі колгаснага прыліву, ператварэньня соцспаборніцтва і ўдарніц[тва] у асноўныя мэтады ўсёй работы, за самае шырокае разгортваньне п[ро]летарскае самакрытыкі. „Чырвоная Зьмена" павінна з усёй баль[ша]віцкай настойлівасьцю змагацца за няўхільнае і пасьлядоўнае ажы[цьця]ўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі, супроць усялякіх х[іс]таньняў ад ленінізму.

Культпроп ЦК КП(б)Б таксама ўпэўнены ў тым, што ўзя[тае] ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьменай" абавязак аб мобілізацыі 50 ком[са]мольцаў-актывістых на раённую газэтную работу будзе выкананы.

Няхай жыве Ленінскі Комсамол і яго баявая газэта—„Чырво[ная] Зьмена"—змагар за соцыялістычнае будаўніцтва, за генэральн[ую] лінію партыі!

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б—Чарнушэвіч

БОЕВОЕ ВЫСТУПЛЕНИЕ КОМСОМОЛЬСКОЙ ГАЗЕТЫ БЕЛОРУССИИ

ЗА ПРОЛЕТАРСКУЮ МУЗЫКУ

ДАТЬ ПЕСНИ, СОЗВУЧНЫЕ НАШИМ ДНЯМ ВЕЛИКОГО СТРОИТЕЛЬСТВ...

...ОТРОТОМ, ...И ТЕЧЕНИЯМИ ...КАЛЬНОМ ФРОНТЕ

КОМСОМОЛЬЦЫ, ...АЙТЕ Р... И ТЕМП БОРЬБЕ ЗА ПРОЛЕТАРСКУЮ МУЗЫКУ И ПЕСНЮ!

„Даць песьні, сугучныя нашым дням вялікай будоўлі.

На бой з балаганшчынай, фокстротам, буржуазна-рэакцыйнымі плынямі і вылазкамі на музычным фронце.

Комсамольцы, дайце размах і тэмп у барацьбе за пролетарскую музыку і песьню!"

З такім лёзунгам выступіла газэта „Чырвоная зьмена"—цэнтральны орган комсамолу Беларусі ў спэцыяльнай старонцы, прысьвечанай музыцы.

Беларусь да самага апошняга часу была адсталым вучасткам музычнага фронту. Адзіным цэнтрам, які рыхтуе музычныя кадры для Беларусі зьяўляецца Менскі музычны тэхнікум.

Ня кажучы аб дрэннай пастаноўцы акадэмічнай работы тэхнікуму, у яго адсутнічае ўсякая сувязь з рабочымі клюбамі; творамі пролетарскіх музыкаў ніхто не карыстаецца, бо „большасьць гэтых твораў, асабліва вокальных, шкодны... для выканаўцаў" (як выказваецца Дрэйзін—пэдагог і заг. нотнай бібліятэкай тэхнікуму). Ня дзіўна таму, што ў нотнай бібліятэцы тэхнікуму захоўваюцца лічаныя экземпляры твораў пролетарскіх композытараў, але за тое ў вялізарнай колькасьці маецца старая рэлігійная расейская музыка.

У рабочай масе працьвітаюць „кірпічыкі", Ясенішчына; рабочыя музгурткі развальваюцца, а музкіраўніку Белрадыё-цэнтру „некалі" займацца пролетарскай музыкай.

У сьвятле гэтых фактаў набывае вялікае значэньне выступленьне комсамольскай газэты Беларусі. У вып[уш]чанай старонцы газэта піша: „У[ся] наша работа на музфронце пр[а]ходзіць у непрымірымай барацьб[е з] клясавым ворагам, яго агентурай і ўс[я]лякімі рэакцыйнымі настроямі.

Факты вылазак клясавага ворага, я[кія] перашкаджае разьвіцьцю пролетарск[ай] музыкі, мы маем у Менскім музтэх[ні]куме, дзе гэтыя выступленьні не суст[]ракаюць адпору.

Мы маем факты, калі бюро і ўс[я] ячэйка, згубіўшы клясавую баяздоль[]насць, праявілі політычную сьлепату.

Выходзячы з гэтага, газэта робіц[ь] зусім правільны вывад аб неабхо[д]насьці карэннай перабудовы работ[ы] музтэхнікуму: „трэба мобілізаваць ув[а]гу—піша ў перадавым артыкуле г[а]зэта, усёй пролетарскай грамадзкас[ь]ці, комсамольскіх ячэяк на та[кі] важнейшы вучастак, як аўладаньн[е] вышынямі будаўніцтва пролетар[]скай музыкі, забясьпечыўшы неа[д]кладнае выкананьне дырэктыў, да[]дзеных па гэтаму пытаньню Х-ты[м] зьездам ЛКСМБ.

Пачаўшы барацьбу за пролетарскую музыку, газэта павінна ўзяць шэфств[а] і сталы кантроль над работай музор[]ганізацый, каб пасьпяхова працягваць барацьбу і давесьці яе да канца.

Часопіс „За пролетарскую музыку" № 2, 1931 г.

Ад рэдакцыі: „Чырвоная зьмена" у бліжэйшы час выступіць з цэлым ш[э]рагам мерапрыемстваў і прапаноў па барацьбе за пролетарскую музыку.

„А выглядала ты старэнькай"...

УДАРНІКІ ЛІТАРАТУРЫ—ЗМАГАРЫ НА ФРАНТОХ ПЯЦІГОДКІ

М. Процька

Алесь Сячко

ДЗЕСЯЦЬ ГЭРОІЧНЫХ

Сягоньня я
Пад звон машын сталёвых
Ўрачыстым днём,
Кіпучым ў барацьбе,
Вітаць
Бяру юнкораўскае слова
Дзесяты
Твой дасягнуты рубеж.

Умчалі дні
Гісторыі вялікай,
Мігалі ў даль
Аквечаных дарог,—
Ты цьвёрда йшла
З юнкорыяй шматлікай,
Да ясных мэт,
Да новых перамог.

Ты за станком
У вэхавыя будні
Раджала ў нас
Нязьмераны парыў.
І прагні мы
Ў штурмавыя тыдні
Зьнішчаць
На фронце выкрыты прарыў.

Гарэлі так
Мацежныя хвіліны
Ў напорах рук
Ўдарніцкіх брыгад;
Ты комсамол
Стотысячнай калёны
Вяла у бой
Будоўчых барыкад.

Твой кожны крок
Нястрыманаю сілай
Зьнішчаў з зямлі
Жабрачы сьлед вякоў:
Дзе сумавалі
Бур'яны пахіла—
Красуе там
Суцэльных шыр палёў.

І дзе гібелі
Хмурыя сялібы
У глушы балот
І ночай-таямніц,
Цяпер гараць
Над зрушанай цалінай
Колгасныя
Магутныя
Агні!

Радкі тваё
Грантных слоў і літар
Нізалі пікамі
Нявераў і дзялег
Ты выкрывала
Шкоднікаў сукрытых,
Кулацтва нішчыла,
Як нам варожы кляс.

Вось,
Я чаму
Пад рокат струн машынных
Цябе вітаю шчыра,
Юбіляр.
Дык і далей-жа
Штурмам бязупынным
Ідзі ў бой
За пяцігодкі план!

А. Сячко.

За новага чалавека

10 гадоў на фактах жыцьця „Чырвоная Зьмена“ куе новых людзей, гартуе бальшавіцкай закалкаю мільённы комсамол, запаляе малады творчы энтузіязм для соцыялістычнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі сваёй энэргічнай творчай працаю у змаганьні за соцыялізм, за перадзелку псыхолёгіі мас, за новага чалавека, „Чырвоная Зьмена“ уцягнула у супрацоўніцтва шырокія колы працоўнае моладзі. Стварыла новы тып грамадзкага дзеяча. Заваявала ў гэтых колах сымпатыю і аўторытэт.

У 10-годзьдзе нельга не адзначыць праробленай „Чырвонай Зьменай“ працы у напрамку выяўленьня і вывучкі ад станка і плуга маладых літаратурных пролетарскіх кадраў.

На нашым культурным вучастку шмат цяжкіх і складаных задач. Літаратурная старонка „Чырвонай Зьмены“ групуючы вакол сябе літаратурныя сілы, узброіўшыся сродкамі мастацкага слова, абстрэльвала сьмяротным агнём: цемру, някультурнасьць, містыку, спадчыну царызму, організоўваючы новую форму жыцьця—комуністычны быт.

У 10-ці годзьдзе трэба сказаць што літстаронка была і ёсьць базісам для папаўненьня маладняком радоў БелАПП'у. „Чырвоная Зьмена“ за сваё існаваньне высунула шмат здольных таварышоў, якія добра знаёмы працоўным масам. Сярод іх лепшыя прадстаўнікі пролетарскай літаратуры: Барашка, Аляхновіч, Аляксандровіч.

Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру павінен разглядацца з пункту погляду мастацкага слова рабочае клясы. З пункту погляду стварэньня пролетарскага літаратурнага асяродзьдзя, якое-б штодзённа, мастацкім словам дзялілася вопытам працы, ударніцтва, спаборніцтва, выкананьня прамфінпляну з рабочаю клясаю і працоўным сялянствам, ажыцьцяўляючы задачы Кастрычніцкай рэволюцыі. Адсюль перад пачынаючымі маладымі сіламі паўстала задача сыстэматычнай гуртковай вучобы, каб аўладаць сродкамі пролетарскага мастацтва.

У 1929 годзе, калі праводзіўся трохмесячнік беларускай пролетарскай літаратуры, БелАПП з дапамогай „Чырвонай Зьмены“ організаваў пачынаючыя сілы у Цэнтральную рабочую літаратурную студыю, якая і зараз існуе пры БелАПП'е.

Для кіраўніцтва і ўзьняцьця продукцыі студыйцаў, БелАПП вылучыў з свайго асяродку таварышоў Аляхновіча, Александровіча і ў апошні час тав. Галавача.



Я. Зазека.

Студыя зараз вырасла колькасна і якасна. Яна налічвае у сваіх радох 28 асоб у асноўным з рабочага асяродзьдзя. 13 з іх комсамольцаў і 2 партыйцы.

У сувязі з заклікам рабочых-ударнікаў у літаратуры, студыйцы разам з членамі БелАПП'у прымацавалі да заводаў гораду Менску для ўцягненьня ўдарнікаў у літаратуру, для стварэньня пролетарскага, мастацкага слова.

Паасобныя члены студыі за кароткі час, дзякуючы энэргічнай вучобе, пайшлі далей, даўшы каштоўную продукцыю нашай пролетарскай літаратуры. Узяць хоць-бы студыйца тав. Процька. Колгасьнік, бядняк, партыец, зараз займаецца на рабфаку. Процька на працягу доўгага часу быў актыўным селькорам газэты „Чырвоная Зьмена“, пасьля чаго пачаў пісаць вершы ў яе літстаронку. Зараз Процька выявіў свае здольнасьці. Яго апавяданьне, якое зьмешчана ў часопісу „Маладняк“ № 2 за 1931 год, „Кулацкі маток“ яскрава, мастацкі адбівае як кулакі, бачачы актыўнасьць працоўнага сялянства ў перабудове вёскі, у дадатак перакапаўшыся ў тым, што ім нельга спыніць поступ соцыялістычнай перабудовы вёскі, уступаюць у колгас, каб узарваць яго знутры.

Такім-жа шляхам да літаратуры прыйшлі: т. т. Алесін, Вісажар, Агняцьвет, Сячко.

Алесін па паходжаньню селянін бядняк. Па зьместу сваёй творчасьці ён хутка змог наблізіцца да пролетарскай літаратуры. Узяць яго апошнія вершы: „Спатканьне“ („Чырвоная Зьмена“ ад 8-га сакавіка 1930 году,“) „Крык машын“ („Маладняк № 3 1930 год) і іншыя вершы. Поэта чуе крокі індустрыі, чуе поэзію нашых дзён.

Тодар Алесін

Сячко, Агняцьвет, Вісажар друкуюцца ў газэтах і часопісах беларускіх выданьняў.

Вершы маладых пералічаных поэтаў гэта багатыя кавалкі сучаснасьці. Яны зьвіняць, організоўваючы новую форму працы—ударніцтва, соцспаборніцтва ў выкананьні 3 га, рашаючага году пяцігодкі, адбіваюць асаблівасьці пачатку пэрыоду соцыялізму. Студыя здала ў друк альманах „Рубільнік.“

28-га красавіка г. г. агульны сход студыі перадаваў у пролетарскую асоцыяцыю пісьменьнікаў т. т. Вісажара, Зазеку, Процьку, Бітуса і ў БелАПП тав. Алесіна. Разам з гэтым былі прыняты ў члены студыі 2 батракі і 2 колгасьнікі бедзякі.

Зараз, у сувязі з заклікам ударнікаў у літаратуру, БелАПП разам з ёй павінен правесьці працу па выяўленьню пролетарскіх кадраў.

Вялікую ўвагу трэба зьвярнуць на вывучку маладняка, каб ён валодаў марксысцкім сьветапоглядам і аўладаў мэтодамі дыялектыкі. «Чырвоная Зьмена,“ уступаючы ў адзінаццаты год свайго існаваньня, павінна змагацца за мастацтва пролетарыяту. За выяўленьне кадраў з рабочае клясы. За аўладаньне высокай продукцый маладых пісьменьнікаў.

Язэп Зазека.

У рэдакцыйным цэху

Сёньня „Чырвонцы“ мінула 10 год. Сёньня яна „агледзіцца“ на свой дзесяцігадовы шлях.

Вялікі шлях... Вялікія „трофэі“!.. 6000 старонак. 30000 калёнак. 2.400.000 радкоў. Кожны радок—гэта стрэл у кулака, опортуніста-га, клясавага ворага. Кожны радок,—організатар соцыялістычнага будаўніцтва. Кожны радок—змагар за генэральную лінію партыі.

* * *

І ў гэтыя дні ўрачыстасьці хочацца сказаць аб тым, як творацца радкі, калёнкі, старонкі і ўся „Чырвоная Зьмена“.

* * *

9 гадзіна раніцы. Энэргія ўключана. Матор заведзены, і рэдакцыйны конвээр-машына запрацавала.

Адчыняецца вытворчая нарада рэдакцыі.

Перад першым судом жорсткай крытыкі і самакрытыкі рэдакцыйнага колектыву прадстае ашліфаваная ім-жа газэта.

Абгаварваецца сёньнешні нумар. „Чырвонка“ ідзе ўверх, а Мішка Платаў усё падцягвае:—„Мы яшчэ дрэнна працуем“;—„шапка слабая“, „мацней біць“—„палепшыць вёрстку“.

Вытворчая нарада з дня ў дзень дае зарадку на чарговы штурм газэтных цытадэляй: „аўладаць тэхнікай“, „палепшыць якасьць газэты“, каб яшчэ больш баявою, зубастаю, непрымірымаю зрабіць „Чырвонку“ у барацьбе за генэральную лінію партыі.

10 гадзіна. Пачынаецца самая вытворчасьць.

Перш за ўсё пляя, вытворчае заданьне.

Усе за рэдакцыйныя „станкі“ (сталы); рэдакцыйным інструмантам прымаюцца за „вытворчыя працэсы“: перапрацоўка „сыравіны“ у „паўфабрыкат“.

Многа „сыравіны“. Сотні допісаў, тэлеграм, тэлефонограм. Кожны дзень з усіх куткоў Беларусі ў парадку „сустрэчных“ і нясустрэчных плянаў шлюць брыгады, юнкоры, брыгадзіры, колгасьнікі, спэцкоры па адрасу: „Менск, рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“.

Тав. Агняцьвет

Трэба апрацаваць, выбраць самую „соль“.

Расставіць факты, лічбы ў газэтныя баявыя радкі, калёнкі; з кожнага радка зрабіць зброю, агітатара і змагара.

Ня лёгка. А тут сэкратар—неспакойны Іткін ужо мітусіцца з пакою ў пакой, ад „станка“ к „станку“ і падганяе :

— Хутчэй, хутчэй!.. Давай у набор, забясьпеч першую партыю!..

Бесьперапынна працуе конвээр-машына...

Пацуе Мікола Пузікаў над пілсудзкімі, брыянамі... Нэрвуецца і крычыць пра торп, пра рацыяналізацыю, фінансы Этка Каганская.

Філёзофствуе, ходзячы рукі ў кішэні пра профэсарскую эклектыку Мішка Вярвікоўскі.

Цячэ апрацаваны, надрукаваны матар'ял на стол сэкратара. Ухмыляецца, задаволен Іткін. Ня будзе практ[illegible] звыш тэрміновых у друкарні [illegible] неперарываў працуе конвээр.

* * *

Стрэлкі шчупаюць трэцюю гадзіну. Зданы ўсе матар'ялы прагледжаны рэдактарам, выпраўлены стылем і бязупынны паток уносіць іх у друкарню, у набор.

А Іткін зноў захваляваўся:

Хлопцы! Макеты, макеты, шапкі, шапкі давай. „Вось тут і загвоздка“. Усё нічога, а шапку даць „ня фунт ізюму“.

Шапка—тэзіс зьместу ўсёй старонкі, падборкі. Камандзір радкоў, калёнак. І таму ў час падбору шапкі яшчэ больш крычыць і нэрвуецца Каганская і спакойна „мазгуе“ Глезэр. І таму яшчэ больш бляднее Дарацкі. А Пузікаў упэўнены —лепш пайшоў-бы біцца з Пілсудзкім, чымся прыдумаць для яго кавэрзаў шапку.

* * *

Нарэшце шапкі, макеты гатовы. Працоўны дзень рэдакцыйнага цэху скончаны. Вытворчы плян выкананы. Бываюць і звыштэрміновыя ў парадку сустрэчнага. Вечарам праводзяцца нарады юнкораў, спэцыялістых, поэтаў і пісьменьнікаў. Раждаюцца новыя ідэі, мерапрыемствы: „Беларусь—тарфяны Донбас“, —„Ліквідуем абязьлічку“.

Газэтны конвээр пераносіцца ў друкарню. Там словы, абзацы, артыкулы, заметкі набіраюцца, ідуць у друкарскі цэх і к раніцы, сьвежыя з неабсохшаю фарбай, 40.000 „Чырвонае Зьмены“ паступаюць у экспэдыцыю.

І ідуць радкі, калёнкі, старонкі ў гарады, колгасы, вёскі, і кожны радок зьнішчае кулака, опортуніста, клясавага ворага, організовае соцыялістычнае будаўніцтва, змагаецца за генэральную лінію партыі.

Дзесяцігадовы шлях „Чырвонкі“ —шлях вялікіх перамог.

А. Усьмінскі

Баявому змагару— „Чырвонай Зьмене“

У дзень 10-цігадовага юбілею—гарачае прывітаньне ад маладых кадраў пролетарскай літаратуры!

Шлях, пройдзены табою, хоць невялікі, але баявы і жорсткі. Ты рашуча змагалася на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, організоўвала і вяла ў бой за генэральную лінію партыі стотысячны комсамол Беларусі.

На тваіх старонках выхаваўся рад пісьменьнікаў і паэтаў, якія ўліліся ў рэчышча беларускай пролетарскай літаратуры.

Ідзі-ж і далей з ленінскай загартованасьцю па выпрабаваным бальшавіцкім шляху.

Цэнтральная літ.-раб. студыя Бел. АПП'у

Вісажар.

У дзень 10-гадовага юбілею--бальшавіцкае прывітаньне „Чырвонай Зьмене“

„Зьвязда“ шле бальшавіцкае прывітаньне баявому органу ЦК ЛКСМБ—„Чырвонай Зьмене“ ў дзень 10 гадовага юбілею.

10 год „Чырвонай Зьмены“—10 слаўных старонак у гісторыі комсамолу Беларусі. Разам з ростам комсамолу расла і газэта. Ад „Красного Факела“, які заклікаў моладзь Беларусі на барацьбу з белапольскімі окупантамі, да „Чырвонай Зьмены“—баявой газэты, якая, пад кіраўніцтвам ЦК ЛКСМ і ленінскай партыі, змагаецца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі, за соцыялістычную рэконструкцыю народнай гаспадаркі, за пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Уступаючы ў 11 год свайго існаваньня, „Чырвоная Зьмена“ павінна яшчэ больш прасякнуць палітычным зьместам кожны радок у газэце, узмацніць барацьбу з правым і „левым“ ухіламі ад генэральнай лініі, з прымірэнцтвам, з праявамі вялікадзяржаўнага шовінізму, нацыянал дэмократызму і шовінізмамі іншых колераў. „Чырвоная Зьмена“ павінна шырэй асьвятляць на сваіх старонках жыцьцё і барацьбу комсамолу капіталістычных краін, палепшыць работу па інтэрнацыянальнаму выхаваньню рабочай моладзі, палепшыць масавую работу сярод юнкораў, весьці ўпартую барацьбу за пасьпяховае выкананьне пляну трэцяга, рашаючага году пяцігодкі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

„Зьвязда“.

Шлях барацьбы замежнай комсамоліі

Ударны двухмесячнік францускага комсамолу

Спаборніцтва і ўдарніцтва ўсё больш прасоўваецца ва ўсе зьвеньні работы замежных комсамольскіх організацый.

Нядаўна цэнтральны камітэт францускага комсамолу абвясьціў ударны двухмесячнік выкананьня і перавыкананьня пяцімесячнага пляну работы саюзу.

Асноўная задача двухмесячніка—завербаваць новыя масы рабочае моладзі.

З пачатку 1931 году комсамол завербаваў 800 новых членаў. К канцу мая павінна быць уцягнута яшчэ 1.000 маладых рабочых. Ужо створаны 15 новых вытворчых ячэек, у бліжайшы час вырашана організаваць яшчэ 25 ячэек, галоўным чынам, на ваенных заводах.

Ва ўдарны 2-хмесячнік комсамол павінен палепшыць работу старых і стварыць сетку новых заводзкіх комсамольскіх газэт, падняць тыраж органу ЦК комсамолу—газэты „Авангард“, ажывіць працу юнацкай сэкцыі профсаюзу і піонэрскай організацыі.

Комсамол кідае лепшыя сілы для працы сярод рабочай моладзі вядучых галін прамысловасьці (мэталюргічнай, горнай, вугальнай, тэкстыльнай), таксама маладых беспрацоўных для барацьбы за патрабаваньні компартыі, комсамолу і унітарных (рэволюцыйных) профсаюзаў. Ва ўсіх акругах ствараюцца баявыя юнацкія камітэты, на чале якіх стаіць комсамол. К 26 красавіка комсамольскія організацыі павінны правесьці агляд-праверку падрыхтоўкі да ўдарнага двухмесячніка.

Ударны двухмесячнік разгортваецца на аснове соцыялістычнага спаборніцтва.

Організацыя, перамогшая ў спаборніцтве, атрымае чырвоны сьцяг комсамолу, які яна захавае да 1 жніўня—міжнароднага чырвонага дня.

Шотляндзкія комсамольцы разгортваюць соцспаборніцтва

Організацыйна комсамол Шотляндыі адставаў ад росту свайго палітычнага ўплыву. Кіраўніцтва організацыі кепска мобілізавала масы рабочае моладзі на барацьбу за патрабаваньні, якія высоўвае комсамол.

Між тым, умовы для росту комсамолу спрыяючыя.

На ўздыме агульная барацьба рабочае клясы, расьце актыўнасьць моладзі. У нядаўняй стачцы гарнякоў было шмат баявых выступленьняў маладых шахцёраў.

Вялізнае беспрацоўе, зьніжэньне зарплаты, убоства—усё гэта штурхае рабочую моладзь на шлях рэволюцыйнай барацьбы пад сьцягамі комсамолу.

Нядаўна адбылася акруговая нарада комсамольскіх ячэек Шотляндыі; абгаварвалася пытаньне аб узмацненьні організацыі.

Выступіўшыя таварышы, адзначаючы, што ў організацыі толькі 106 чалавек, заклікалі па-ўдарнаму распачаць уцягненьне рабочае моладзі ў комсамол.

Нарада рашыла пачаць абмен вопытам паміж паасобнымі організацыямі і ячэйкамі, Прадстаўнік нядаўна організаванай ячэйкі ў Кодбрыджы, паведаміў, што іх ячэйка стварыла спортыўны клюб, павялічыла распаўсюджваньне комсамольскай газэты „Янг Уоркер“, правяла падрыхтоўку для стварэньня комсамольскай ячэйкі ў адной з бліжайшых вёсак.

Ячэйка выклікала ўсе організацыі комсамолу на соцыялістычнае спаборніцтва, высунуўшы ў якасьці галоўных паказчыкаў уцягненьне новых членаў і павялічэньне падпіскі на „Янг Уоркер“.

Нарада паставіла перад шотляндзкай організацыяй задачу: у бліжэйшы час удвая павялічыць лік комсамольцаў. Усю працу праводзіць на аснове соцыялістычнага спаборніцтва. Нарада падвяла вынікі і намеціла далейшыя этапы барацьбы за „рабочую хартыю“—програму мінімум патрабаваньняў, высунутую компартыяй і рухам меншасьці (рэволюцыйная профопозыцыя).

Абраны на нарадзе часовы акруговы камітэт абяцаў ва ўдарным парадку падрыхтаваць усё да зьезду шотляндзкіх комсамольскіх організацый.

Ня толькі колькасна, але і якасна

Юнкоры „Ч. З.“ не толькі твораць газэту, але праз яе выхоўваюцца і палітычна клясава растуць, адпаведна з тымі задачамі, якія пастаўлены партыяй і рабочай клясай.

Твар юнкора ў параўнаньні з мінулымі гадамі рэзка зьмяніўся.

З кожным часам, з кожным днём растуць рады юнкораўскай арміі. Калі ў 1929 годзе „Ч. З.“ мела 600 юнкораў, дык за 1930 год юнкораўская армія вырасла на 1253 чалавекі, а за чатыры месяцы 1931 году—на 547 чалавек.

Гэтыя лічбы—лепшыя сьведкі вялікіх заваёў і дасягненьняў ленінскага комсамолу Беларусі і яго баявога органа—газэты „Чырвоная Зьмена“.

Адданасьць гэтай арміі пролетарыяту і яго авангарду — комуністычнай партыі характарызуецца, тым, што за апошні час мы маем больш пазытыўныя формы організацыі працы; вытворча-бытавыя камуны, вытворчыя брыгады і іншыя.

Акрамя гэтага, за апошні толькі час было організавана 80 брыгад і

пастоў „Чырвонай Зьмены“ з 460 ударнікаў-юнкораў, якія на практычнай працы ажыцьцяўляюць баявыя, неадкладныя пытаньні дня.

Узрошчаная актыўнасьць усяго ленінскага комсамолу і рабочае моладзі патрабавала ад газэты „Ч. З.“ паўнасьцю перабудавацца ў адпаведнасьці з запатрабаваньнем рэконструкцыйнага пэрыяду.

Пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі і ЦК ЛКСМБ газэта па-сапраўднаму павярнулася тварам да вытворчага жыцьця, стаўшы рупарам і організатарам новых ідэй і форм соцыялістычнае працы. Дзякуючы гэтаму, маса комсамольцаў, беспартыйнай і працоўнай моладзі стала больш цікавіцца газэтай, якая дае практычны напрамак у працы. Паказчыкам гэтага можа паслужыць тыраж „Ч. З.“: 1925 год—5000 экз., 1928 год.—15000 экз., 1931 год—35 тысяч экз.

На гэтым мы спыняцца не павінны. Тыраж газэты павінен быць даведзены да 60 тысяч. Аб гэтым павінен памятаць кожны комсамолец, кожны юнкор-ударнік.

Праз газэту мы яшчэ больш павернемся тварам да вытворчага жыцьця, тварам да гаспадарча-палітычных задач, выхоўваючы і папаўняючы рады арміі юнкораў, вядучы ўпартую працу за пераўтварэньне ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю.

Ю. і М.

ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПРЫНЦЫПАЎ ЛЕНІНІЗМУ

Сход комсамолу і беспартыйнай моладзі м. Капыля у дзень дзесяцігодзьдзя юбілею „Чырвонай Зьмены“ шле рэволюцыйнае прывітаньне. Сход са здавальненьнем адзначае прароблену працу „Чырвонае Зьмены“ у барацьбе за генэральную лінію партыі і па мобілізацыі комсамолу і беспартыйнай моладзі на важнейшыя ўчасткі соц. будаўніцтва і ў далейшым спадзяецца, што „Чырвоная Зьмена“ пад кіраўніцтвам ЦК ЛКСМБ яшчэ больш будзе змагацца за ажыцьцяўленьне прынцыпаў ленінізму і генэральнай лініі партыі.

„Чырвоная Зьмена“ яшчэ больш павысіць сваю ролю па мобілізацыі мас комсамолу на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Сход бярэ на сабе абавязацельства давесьці выпіску „Чырвонай Зьмены“ ў Капыльскім раёне да 700 экзэмпляраў.

Няхай жыве баявы орган ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена“!

Няхай жыве кіраўнік і організатар „Чырвонае Зьмены“ ЦК ЛКСМБ

Няхай жывуць і мацнеюць юнкоры і ўдарнікі!

Прэзыдыум сходу.

Усе сілы, усю энэргію маладых ударнікаў

Дарагому юбіляру--баявой „Чырвонцы,“ маладыя ўдарнікі ф-кі „Чырвоная Бярэзіна,“ „Пралетарская Перамога“ і ЦЭС імя Леніна шлюць сваё шчырае прывітаньне.

Мы запэўніваем цябе і ў тваёй асобе ўвесь чырвонаштандарны ленінскі комсамол, што ўсе сілы, усю энэргію кінем на поўнае выкананьне рашэньняў зьезду, на ліквідацыю прарываў, на бальшавіцкае аўладаньне тэхнікай.

— Тэхніка будзе нашай—так гавораць табе маладыя ўдарнікі і так гэта будзе.

Няхай жыве і мацнее ленінскі комсамол і яго баявая газэта—„Чырвоная Зьмена“!

Зьлёт маладых ударнікаў.

РОСТ ІМЯ XI МДТ

„Зьезд у гэтай галіне ставіць адказьнейшую задачу:

Ахоп у бліжэйшыя гады 100 проц. дзяцей рабочых, батракоў беднякоў і колгасьнікаў піонэр організацыяй.

Выходзячы з гэтага зьезд пастанаўляе; пры кожнай вытворчасьці, саўгаснай ячэйцы стварыць піонэр-базы, пры ўсіх колгасных ячэйках—піонэратрады“.

(З рэзолюцыі IX зьезду УсеЛКСМ)

Мы прышлі на вечар, калі ён ужо пачаўся. Больш 800 чалавек занялі вялікую залю клюбу Праасьветы. Мора дзіцячых галоў. Сярод іх шмат дарослых рабочых фабрыкі „Кастрычнік“. Сьцены ўпрыгожаны баявымі лёзунгамі XI МДТ і 1-га мая.

На сцэне важаты базы трымае ўступнае слова аб XI МДТ:

„IX і X зьезды комсамолу паставілі перад піонэрскай організацыяй вялікую задачу ў галіне росту: на 100 проц. уцягнуць дзяцей рабочых колгасьнікаў, батракоў беднякоў у рады піонэрскай організацыі..,

Выконваючы задачы, што пастаўлены партыяй і комсамолам перад піонэрскай організацыяй, мы павінны дабіцца каб неорганізаваныя рабяты былі актыўнымі ўдзельнікамі штодзеннай працы атрадаў.

Пасьля уступнай прамовы пачаўся „жывы каляндар“ XI МДТ. Разбіўшыся на групы. піонэры ў розных кангох залі організавана па чарзе расказалі усю гісторыю міжнароднага дзіцячага комуністычнага руху.

Рапорт піонэр - базы, прывітаньне, прэміяваньне лепшых ударных груп і брыгад.

Урачыстая частка вечару 3-х пакаленьняў заканчваецца здачай урачыстага абяцаньня піонэрамі.

* * *

На сцэну ўваходзяць адзін за адным рабяты. Іх было шмат. З сім ціха стала ў залі. Піонэры навічкі здавалі ўрачыстае абяцаньне.

У залю яны зьвярнуліся ўжо аформленымі піонэрамі, у чырвоных гальштуках.

50 дзяцей рабочых, праверавых на практычным удзеле ў штодзённай барацьбе за прамфінплян, колгасы, усенавуч, політэхнізацыю уліліся ў рады юных ленінцаў.

50 новых піонэраў—вось рост імя XI МДТ менскай піонэр-базы „Кастрычнік“.

* * *

Расьце і ўзмацняецца армія юных ленінцаў.

Да 1-га ўсебеларускага зьлёту база „Кастрычнік“ мела 160 піонэраў. Яны складалі 3 піонэрскі атрады. Акцябрат ня было.

Да XI МДТ база налічвае 107 піонэраў і акцябрат, організаваных у 12 піонэр-атрадаў і 6 груп акцябрат.

Да 2-га ўсебеларускага зьлёту піонэраў менская база „Кастрычнік“ павінна прыйсьці яшчэ з большымі посьпехамі ў галіне выкананьня задач па росту піонэрскіх радоў.

Яшчэ ня ўсе пролетарскія дзеці ўцягнуты ў рады піонэраў.

На пытаньні росту ня толькі ўсім піонэрскім атрадам, але і ўсім комсамольскім ячэйкам трэба зьвярнуць належную ўвагу.

Пастановы IX і X зьездаў комсамолу павінны быць выкананы.

Л-ка.

Не паўтараць леташніх памылак

Летасьць частка ўстаноў і колгасаў Слуцкага раёну аднеслася абыякава да сілосаваньня.

Былі факты, што пасланыя з гораду брыгады па сілосаваньню вараталіся назад Колгасы не давалі ім працы („Чырвоны Маяк“, „Прамень комуны“ „Прогрэс“ і інш).

Але у многіх колгасах, пры напорыстасьці комсамольцаў энтузіястых, сілос быў закладзены, хоць у маленькіх ямах траншэях

І калі сёлета адчынялі гэтыя самыя сілосныя ямі, стала відна рэальнасьць і карысьць сілосу; ён на лаву ўзяўся.

Ня гледзячы аднак на урокі мінулага году існуе рэальная пагроза што леташнія памылкі могуць паўтарыцца, згодна пляну павінны быць пабудаваны дзьве сілосныя башты і ў кожным колгасе па адной вялікай сілоснай яме. А Райколгассаюз ня мае яшчэ сталага пляну па сілосаваньню і наогул гэтым пытаньнем не займаўся.

На пляну трэба засеяць 385 га сілосных культур, але патрэбнага насеньня ў ная нясьці толькі палова.

Трэба зараз-жа узяцца за бальшавіцкае праваджэньне сілоснай кампаніі і гэтым самым папярэдзіць магчымыя прарывы. Комсамол Случчыны павінен быць на чаку і стаць ініцыятарам выкананьня пляну сілоснага будаўніцтва.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ Прыбытак Ян.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўліт 669